Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАННЯ—XV
№ 118 (4022)
АЎТОРАК, 5 МАЯ
1931 г.
ГОЦ КОШТУ 5 КАП.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

ГАЗАВЫМІ БОМБАМІ, ШТЫКАМІ І КУЛЯМЕТАМІ

польскі фашызм імкнуўся задушыць першамайскія рэвалюцыйныя выступленьні працоўных

ПА ЗАКЛІКУ КАМПАРТЫІ ПРАЛЕТАРЫЯТ ВЫШАЎ НА ВУЛІЦУ

Бурныя дэманстрацыі па ўсёй краіне

Крэдытную рэформу— У жыцьцё

Новая сыстэма крэдытаваньня набыла сіл.

Зжыўшае сябе крэдытаваньне пад плян, яксе вельмі часта спараджала бездапасчасьць і безгаспадарчасьць, рашучка і беспаваротна вынрэсьлена з практыкі фінансавых органаў.

Крэдыт пад канкрэтную зьдзелку, дагавор, штодзённы кантроль рублём выкананьня вытворчых заданьняў, жорсткі гаспадарчы разрахунак — вось асноўныя прынцыпы сацыялістычнага плянаваньня і кіраўніцтва народнай гаспадарнай на даным этапе нашага разьвіцьця. Пасьлядоўнае і выразнае ажыцьцяўленьне гэтых прынцыпаў забясьпечыць максымальную эфэктыўнасьць ва ўсіх галінах народнай гаспадарні, паскорыць тэмпы сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце.

Як жа прамысловасьць, каапэрацыя і гаспадарчыя арганізацыі БССР падрыхтаваны да пераходу на новую сыстэму крэдытаваньня? Наколькі поўна прынцып гаспадарчага разрахунку знаходзіць сваё ўжываньне ў нізавых гаспадарчых зьвеньнях?

На жаль, адказ на гэта пытаньне прыходзіцца даваць ЯЎНА АДМОЎНЫ.

Ня гледзячы на тое, што новая крэдытная рэформа набыла моц з 1 мая, мы яшчэ ня вышлі з першай падрыхтоўчай стадыі рэформы — заключэньня дагавораў. Наперакор катэгарычным дырэктывам партыі і ўраду скончыць дагаворную кампанію да 20 красавіка, яшчэ НА СЕНЕШНІ ДЗЕНЬ ЛЁКАЛЬНЫЯ ДАГАВАРЫ Ў СВАЁЙ ПЕРАВАЖНАЙ ЧАСТЦЫ НЕ ЗАКЛЮЧАНЫ. Дагаворная кампанія закончана ды і то яшчэ няпоўнасьцю, толькі па лініі генэральных згод. Асноўная маса прадпрыемстваў і нізавых гаспадарчых арганізацый дагавораў яшчэ ня мае.

Рад цэнтральных органаў, у асаблівасьці аб'яднаньні, вельмі спазьніўшыся з разгортваньнем кампаніі, яшчэ і зараз не разварушыліся ў справе апэратыўнага кіраўніцтва сваімі прадпрыемствамі, у справе аказаньня ім практычнай дапамогі. Асабліва адстаюць Белмэталаб'яднаньне, шклоаб'яднаньне і запалкавае аб'яднаньне.

Фактычна яшчэ сур'ёзна НЯ ПРЫСТУПЛЕНА да пераводу на гаспадарчы разрахунак цэхаў, брыгад, арэзтараў. Амаль нічога ня зроблена па падрыхтоўцы да новай крэдытнай рэформы РАХУНКОВАГА АПАРАТУ прадпрыемстваў і гаспадарчых арганізацый. У гэтай сувязі нельга прайсьці міма таго, што Наркамправы да гэтага часу ня выканаў пастановы СНК аб мабілізацыі 90 чалавек рахункоўных работнікаў для работы ў банках.

Вялізарным недахопам дагаворнай кампаніі зьяўляюцца шматлікія выпадкі ФАРМАЛЬНАГА ПАДЫХОДУ ДА ЗАКЛЮЧЭНЬНЯ ДАГАВАРОЎ, імкненьні зьняць з сябе матар'яльную адказнасьць, жаданьне знайсьці ўсялякія «лазейкі» аж да аговарачак аб «непрадбачных стыхійных няшчасьцях» і г. д. Якасьць заключаных дагавораў у радзе выпадкаў з гэтага пункту гледжаньня надзвычай нездавальняючая, што цягне за сабой шматлікія выпадкі адмены дагавораў органамі РСІ і Дзяржбанку.

Негатовы да практычнага ажыцьцяўленьня рэформ яшчэ і самі БАНКАЎСКІЯ ОРГАНЫ. У цэлым радзе філіялаў Белдзяржбанку вельмі дрэнна стаіць справа з ліквідацыяй запускаў, улікам, расчысткай рахункаў, іх зьверкай і г. д. Інструктаж і практычнае кіраўніцтва Белдзяржбанку сваім нізавым апаратам невыстарчальныя.

Мы прымушаны канстатаваць, што з боку раду гаспадарчых, і нават некаторых партыйных, органаў праяўляецца яўная НЕДААЦЭНКА гаспадарча-палітычнай важнасьці своячасовага і выразнага правядзеньня ў жыцьцё новай сыстэмы крэдытаваньня, а часам і простае ёй процідзейнічаньне. Апартуністычнае супраціўленьне лініі партыі ў пытаньнях гаспадарчага разрахунку ня ўсюды знаходзіць патрэбнае вырыцьцё і адпор. Размовы аб «непадрыхтаванасьці» да рэформы, аб неабходнасьці адтэрміноваваньня, нежаданьне праводзіць у жыцьцё прынцыпаў гаспадарчага разрахунку — не адзінкавыя выпадкі, усё гэта ёсьць яшчэ і на сёнешні дзень.

Паасобныя парторгана замест рашучага адпору ўсім апартуністычным «разважаньням» паўсталі на шляхі простага скажэньня дырэктыў партыі і ўраду ў галіне ажыцьцяўленьня крэдытнай рэформы. Так, ДРЫСЕНСКІ райком партыі і райКК-РСІ фактычна парушылі тэрмін пераходу на новыя формы крэдытаваньня, даўшы праўленьню спажывецкага таварыства адтэрміноўку ўкласьціся ў ліміт да 15 мая. Дзяньні мясцовай канторы банку, якая закрыла крэдыт райспажыўтаварыству ў сувязі з перавышэньнем апошнім сваіх лімітаў на 100 тыс. руб., былі мясцовым кіраўніцтвам апратэставаны. У БУДА-КАШАЛЁЎСКІМ РАЁНЕ на нарадзе гаспадарнікаў па пытаньнях крэдытнай рэформы мелі месца яўна апартуністычныя выступленьні. Так, старшыня насеннаводсаюзу—Церпякоўскі, заве кантроль рублём «галавакружэньнем», старшыня кавпсаюзу ў сувязі з пытаньнем аб матар'яльнай адказнасьці заяўляе: «у такіх умовах мы працаваць ня будзем. Наогул — гэта неажыцьцявімая справа». Старшыня калгасаюзу пусьціўся ў разважньні аб тым, што «для кожнай рэформы неабходны максымальныя тэрміны, інакш мы правалім усе гаспадарчыя кампаніі». На нарадзе высьветлілася, што пастановы партыі і ўраду аб новай крэдытнай рэформе наогул многім мясцовым работнікам невядомы. Адносіны райкому да крэдытнай рэформы відаць хаця-б з таго, што ў самы гарачы момант кіраўнік аддзяленьня банку спасылаецца на... бульбазагатоўкі.

Прыведзеныя факты выклікаюць самую сур'ёзную трывогу. Яны з усёй відавочнасьцю гавораць, што яшчэ дзені-дзе няма разуменьня ўсяго вялізарнага значэньня новай крэдытнай рэформы, што апартуністы, выконваючы сацыяльны заказ клясавага ворага, бязкарна тармозяць ажыцьцяўленьне важнейшага мерапрыемства партыі. Падобнага роду зьявішчам трэба рашуча і безадкладна пакласьці канец.

Трэба з усёй поўнасьцю і яснасьцю сказаць, што ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК — АСНОЎНЫ ПРЫНЦЫП НАШАГА ГАСПАДАРЧАГА БУДАЎНІЦТВА І ПАРТЫЯ НЕ ДАЗВОЛІЦЬ НІКОМУ АДСТУПАЦЬ АД ЯГО.

Перад намі стаіць баявая задача — на працягу БЛІЖЭЙШЫХ-жа дзён поўнасьцю навярстаць прапушчанае, ахапіць сыстэмай дагавораў УСЕ галіны гаспадарчай работы, разьвярстаць крэдыт па нізавых органах, разчысьціць рахункі. Трэба цьвёрда запамятаць, што новая крэдытная рэформа набыла моц ва ўсёй паўнаце з 1 мая і адсутнасьць дагавораў у тэй ці іншай арганізацыі ніколькі не азначае, што ёй будуць даны якіясьці адтэрміноваваньні і паблажкі. Наадварот, трэба цьвёрда запамятаць, што для тых арганізацый, якія ня маюць дагавораў, крэдыт УЖО ЗАКРЫТ і адказнасьць за ўсе вынікі нясуць гэтыя арганізацыі. У гэтым сэнс новай рэформы.

Намі пройдзен толькі падрыхтоўны этап ажыцьцяўленьня новай сыстэмы крэдыту і пераходу на гаспадарчы разрахунак. У бліжэйшыя ДНІ гэты этап павінен быць завершан поўнасьцю.

Усе свае сілы, усю энэргію мы павінны будзем пераключыць на РЭАЛІЗАЦЫЮ ЗАКЛЮЧАНЫХ ДАГАВАРОЎ, на штодзенны кантроль рублём ходу выкананьня вытворчых заданьняў, на прасякненьне гаспадарчага разрахунку ва ўсе поры гаспадарчага арганізму краіны.

СЮДЫ павінна быць прыкавана ўвага ўсёй рабочай клясы і ўсіх не арганізацый. Сюды павінна быць накіравана творчая актыўнасьць шырачэйшых працоўных мас. Кантроль рублём, гаспадарчы разрахунак — павінны стаць цэнтральнай задачай сёнешняга дня.

Ажыцьцяўляючы новы парадак крэдытаваньня, ператвараючы ў жыцьцё ленінскую ідэю гаспадарчага разрахунку, мы пераводзім справу кіраваньня народнай гаспадаркі на вышэйшую ступень. Наперакор усім прошукам клясавага ворага і яго агэнтуры — апартуністаў, — мы аўладаем вышынямі сацыялістычнага гаспадараньня, цьвёрда і ўпэўнена пойдзем па шляху завяршэньня пабудовы фундаменту сацыялістычнай эканомікі.

Дзевятнаццаць год бальшавіцкай „Правды“

Споўнілася роўна 19 год з моманту нараджэньня бальшавіцкай «Правды». Яе слаўнай папярэдніцай пасьля рэвалюцыі 1905 году была штотыднёвая легальная марксыцкая газэта «Зьвязда», якая пачала выходзіць у перыяд глыбокай рэакцыі ў 1910 годзе, калі клясы капіталістаў, адабраўшы ўсе заваёвы рэвалюцыі, разьвівала сваё наступленьне на рабочыя рэвалюцыйныя рухі. У праграме гэтага наступленьня азьвяраліся імпэрыялізм адным з важнейшых пунктаў стаўкі адабраць у рабочых і іх авангарду бальшавіцкай партыі — свабоду друку. «Зьвязда», нападаючы пад самыя жорсткія прасьледаваньні і рэпрэсіі, выкрывала здрадніцтва ўсіх ліберальна-меншавіцкіх партый, вядучы жорсткае змаганьне супроць ліквідатараў, згуртоўвала вакол бальшавіцкай партыі лепшых перадавых рабочых і да перыяду новага рэвалюцыйнага ўздыму ў вырачэньных рабочых масах стварыла цьвёрдую сьвядомасьць і пераконанасьць у неабходнасьці барацьбы за выданьне штодзённай легальнай бальшавіцкай газэты.

Палітычныя стачкі ў адзнаку студзеньскіх здарэньняў 1905 году, рух рабочых мас з прычыны перагляду «справы» сацыял-дэмакратычных дэпутатаў другой дзяржаўнай думы і, нарэшце, у красавіку месяцы расстрэл рабочых Ленскіх залатых прыскаў—усе гэтыя фактары ўздыму рэвалюцыйнага руху паскорылі выхад «Правды». «Правду» выпесла на сваім грабні хваля рабочага руху, які пачаўся ў 1912 годзе». (Ленін).

Нарадзіўшыся ў агні жорсткіх клясавых баёў пралетарыяту з капіталізмам, праз жорсткія перашкоды, праз жудасныя прасьледаваньні і рэпрэсіі, «Правда», пад кіраўніцтвам свайго творцы—бальшавіцкай партыі, абуджала рабочыя масы, узьнімала іх рэвалюцыйную энэргію, заклікала да рэвалюцыі, арганізуючы пралетарыят вакол асноўных палітычных лёзунгаў партыі. «Правда» з першых-жа дзён свайго выхаду была сапраўды масавай рабочай газэтай, ня толькі таму, што яна стаяла на варце інтэрэсаў рабочае клясы, што падтрымлівалася рабочымі масамі матар'яльна, але і таму, што ў вельмі вялікай ступені складалася з матар'ялаў саміх-жа рабочых. «За «Правдой» стаялі дзесяткі і сотні тысяч рабочых, якія сваімі капечнымі ўзносамі перамаглі і ўціск царэчнымі ўзносамі перамаглі і ўціск царызму, і канкурэнцыю дробна-буржуазных прадажнікаў сацыялізму, «меншавікоў» (Ленін). Правда» была тым арганізуючым цэнтрам, вакол якога згуртоўваліся ленінскія сілы падыходзячай пралетарскай рэвалюцыі. Інакш і быць не магло. «Правдой» кіраваў з за-граніцы Уладзімер Ільліч Ленін, знаходзячыся ў той час у эміграцыі.

Царскі ўрад і ўся чорная рэакцыя не магла адносіцца бяз злобнай нянавісьці да сьмелага рэвалюцыйнага голасу рабочай газэты. Прасьледаваньне, рэпрэсіі, канфіскацыі, штрафы сыпаліся на «Правду». З выхадзных за два гады 515 нумароў было канфіскавана 134, аштрафавана 31 і ў вогуле падвергнута рэпрэсіі 168 нумароў. Гэта ня лічачы асобных судовых пераследаваньняў на розных артыкулах, закранаючых царскай уладу. «Правда» у сувязі з гэтымі жорсткімі рэпрэсіямі вымушана была за два гады дзевяць раз зьмяняць сваю назву. «Северная», «Рабочая правда», «Правда», «Правда труда», «За правду», «Пролетарская правда», «Путь правды», «Рабочая», «Трудовая правда»—пад гэтымі назвамі выходзіла «Правда» аж да траўня, пакуль царскі ўрад канчаткова не зьдушыў яе, да лістапада 1914 г.

Пасьля лютаўскай рэвалюцыі 1917 г., калі часовы буржуазны ўрад Керэнскіны ўвёў «свабоду друку», пасьля дзесяць доўгага перапынку, «Правда» зноў адновіла свой выхад. Яна выпусьціла першы свой нумар 5-га сакавіка (с. ст.) 1917 году і зноў з бальшавіцкай энэргіяй пачала арганізоўваць рабочыя масы вакол палітычных лёзунгаў бальшавіцкай партыі, выкрываючы здрадніцкую палітыку меншавіцкіх і эсэраўскіх партый, здрадніцкую палітыку часовага ўраду ў адносінах да працоўных мас, пачала зноў пракладваць шлях пралетарскай рэвалюцыі.

Але ледзь выйшла 99 нумароў, як беларгвардзейская афіцэрышчына Керэнскіны (5-га (18) ліпеня 1917 году), ратуючы рэдакцыю «Правды», гэтым самым лішні раз даказаўшы сутнасьць «свабоды друку», якая дэкларуецца ўрадамі т. зв. «дэмакратычных» рэспублік. Пасьля разгрому «Правды» зноў вымушана выходзіць пад рознымі назвамі («Лісток правды», «Рабочай и солдат», «Пролетарий», «Рабочий», «Рабочий путь») да моманту кастрычніцкага паўстаньня.

Мы ў даным артыкуле даем толькі некоторыя асноўныя моманты, падаем асобныя факты з гісторыі «Правды», бо апісаць гісторыю бальшавіцкай «Правды», аб яе змаганьні пад кіраўніцтвам партыі за перамогу пралетарскай рэвалюцыі — гэта значыць пісаць аб гісторыі рэвалюцыйнага рабочага руху, аб змаганьні бальшавіцкай партыі за сацыялізм.

Шлях бальшавіцкай «Правды»—слаўны шлях. **«Правда» выпускам кожнага з сваіх нумароў наносіла сьмяротныя ўдары капіталістычнаму сьвету.** «Правда» зьявілася адным з магутнейшых арганізатараў Кастрычніцкага паўстаньня. Яна клікала на **барыкады тысячы** і мільёны перадавых пралетараў. Яна арганізоўвала перамогу пралетарыяту.

Пасьля пралетарскай рэвалюцыі 1917 году, з прыходам нашай бальшавіцкай партыі да ўлады, роля «Правды» ў барацьбе за замацаваньне Кастрычніцкіх завяёў, за перамогу сацыялізму яшчэ больш вырасла.

Мабілізуючы масы, заклікаючы іх на бой з інтэрвэнцыяй, на перамогу блёкады і белагвардзейскіх банд, «Правда» на працягу ўсяго перыяду зьдзялася магутнай зброяй у руках бальшавіцкай партыі і ў справе замацаваньня ня стаўлёвых радоў, выкрываючы ўсялякія хісталёвы і ўхілы ад ленінізму. У гады грамадзянскай вайны «Правда», а разам з ёй і ўвесь народжаны Кастрычніцкай рэвалюцыяй партыйна-савецкі друк выступілі адным з магутных арганізатараў перамогі пралетарскай рэвалюцыі. «Правда», разам з усім партыйна-савецкім друкам першай пралетарскай дзяржавы праводзіла ваенна-мабілізацыйную работу, падрыхтоўвала масы да барацьбы супроць ворагаў пралетарскай рэвалюцыі — імпэрыялістаў і белагвардзейцаў.

У годы мірнага будаўніцтва «Правды» зьявілася адным з буйнейшых, самых баяздольных і стойкіх арганізатараў трандыёўных перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Пры пераходзе да новай эканамічнай палітыкі, «Правда» выканала незвычайна важную і адказнейшую задачу, растлумачыла масам сутнасьць і задачы новай, мабілізаваной і яшчэ больш згуртаванай рады бальшавікоў вакол ленінскага ЦК УсеКП(б) і правяла вялікую работу па перакананьні іх на выкананьне новых задач—задач адначасьнага разбуранай народнай гаспадаркі. Праводзячы масавыя агляды, масавыя кампаніі, вытворчыя нарадкі, б'ючы на бюракратызм і бальшавіцкія ўзоры ў замацаваньні калгаснага будаўніцтва. Выкрываючы і напосячы зьнішчальны ўдар на правых апартуністах, на «левых» загібшчыках, «Правда», пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК і аллюстроўваючы генэральную лінію партыі, зьявілася настоямым правадніком ленінскіх ідэй добраахвотнасьці ў пытаньнях аб'яднаньня бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы.

Партыя на працягу ўсёй сваёй слаўнай гісторыі была цесна зьвязана з рабочымі масамі. У гэтым моц і сіла бальшавіцкай «Правды». «Правда» дала дзесяткі і сотні новых форм сувязі нашага партыйна-савецкага друку з масамі. Як цэнтральны орган нашай партыі, «Правда» згуртавала вакол сябе сотні тысяч рабселькораў і дала новы попыт, новыя формы масава-творчай работы, адпаведнай задачам перыяду сацыялістычнага наступленьня. «Правда» зьявілася ініцыятарам і арганізатарам разгортваньня ўдарніцтва ў друку. Ударныя брыгады «Правды» далі першы попыт арганізацыі імі ўдарных і апэрацыйных брыгад і груп на заводах і ў зьмясках. На вопыце «Правды» зусім выразна даказана, што цэнтральная фігура рабселькораўскага руху ў перыяд сацыялістычнай рэканструкцыі становіцца рабкораўская ударная брыгада, рабкор-ударнік, а не рабкор-інфарматар, пасыўны наглядальнік працэсаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Бальшавіцкая «Правда», уступаючы ў дваццаты год свайго існаваньня, змагаючыся за ажыцьцяўленьне праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі, пастаўіць у рады актыўных будаўнікоў сацыялізму новыя мільёны рабочых і бядняцка-серадняцкага сялянства.

«Правда», заснаваная, і кіраваная непасрэдна Леніным з слаўнымі бальшавіцкімі традыцыямі, яшчэ з большай энэргіяй будзе змагацца за генэральную лінію партыі.

Бальшавіцкае прывітаньне ленінскай «Правдзе» у дзень яе 19-гадовага юбілею!

Скрозь першамайскі тэрор праглядвае твор інтэрвэнцыі

Дзень 1 мая ў фашысцкай Польшчы сьведчыць аб далейшым бязупынным уздыме рэвалюцыйнага руху, аб росьце рэвалюцыйнай актыўнасьці, баявой рашучасьці шырокіх рабочых і сялянскіх мас. Першамайскія дэманстрацыі сьведчаць аб росьце ўплыву камуністычнай партыі сярод рабочай клясы і працоўнага сялянства, аб усё большай згуртаванасьці працоўных пад яе сьцягамі.

Польскі фашызм, каб не дапусьціць першамайскай дэманстрацыі, у адным толькі Варшаве мабілізаваў тысячы паліцэйскіх, вайсковыя часьці з кулямётамі, газавымі бомбамі, дзесяткі бронікоў, грузавых аўтамабіляў, матацыклаў і г. д. Больш таго, для барацьбы супроць рэвалюцыйных выступленьняў рабочых быў створан нават спэцыяльны штаб пад кіраўніцтвам самога варшаўскага ваяводы — Яранэвіча. Былі паставлены на ногі дэфэнзіва, шпікі, мабілізаваны фашысцкія і сацыял-фашысцкія баёўкі. Адным словам. **Варшава і мая ператварылася ва ўзброены паліцэйскі лягер.**

І вось наперакор забароне, ня гледзячы на зьверскі паліцэйскі тэрор, працятарыят Варшавы па закліку кампартыі выступіў на вуліцу. Камуністычныя дэманстрацыі былі значна больш шматлікімі і актыўнымі чым у мінулым годзе. У іх брала ўдзел каля 10.000 чал. Ня гледзячы на тэрор, дэманстрацыі адбываліся з раніцы да позьняга вечара. Трамвайны і аўтобусны рух у горадзе быў сьпынен. Большая частка фабрык і заводаў стаяла. Баставалі нават рабочыя ваенных заводаў, як «Поніск», дзяржаўны бомбамі, тэлефонны завод, тытунёвая фабрыка, галоўныя чыгуначныя майстэрні і г. д.

Усякі раз, калі ў якой-небудзь часьці гораду зьяўлялася рабочая дэманстрацыя, разьюшаная паліцэйшчына прыкладамі, палкамі, кулямётамі разганяла дэманстрантаў. Фашысцкія-ж і сацыял-фашысцкія баёўкі — дык проста расстрэльвалі рабочых дэманстрантаў з рэвальвэраў.

Як паведамляе фашысцкая прэса, масавыя дэманстрацыі і буйныя крывавыя сутычкі адбыліся ва ўсіх прамысловых цэнтрах Польшчы. У Сасновіцах (Дамброўскі басэйн), у Чэлядзі, Грудзёнзе, Пясткове, Дамброве, Лодзі — ва ўсіх гэтых гарадох адбыліся бурныя дэманстрацыі, пры чым, паліцыя кулямётамі і шашкамі нагола разганяла дэманстрантаў. У крывавых сутычках з паліцэйскімі шмат рабочых забіта, а яшчэ больш паранена. У Любартове (Люблінскае ваяводзтва) атрад паліцэйскіх з шабэлямі нагола кінуўся на дэманструючых рэвалюцыйных сялян. Абураныя сяляне адказалі градам камянёў. Частка паліцыі была разброєна сялянамі. Толькі пова выкліканы атрад паліцыі залпамі разагнаў дэманстрацыю, пры чым, **2 сялян забіта, шмат параненых. У Маневічах, Голобах,** (Ковельская павета), **Кутне, Еэёрне** адбыліся бурныя дэманстрацыі рэвалюцыйных рабочых і сялян і адначасова крывавыя сутычкі з паліцыяй. **Дзесяткі сялян налічваецца забітых, сотні параненых.**

Як паказвае гэта пяноўная зводка сьвяткаваньня 1 мая ў фашысцкай Польшчы—бурлінь рэвалюцыйнае хвалі, падымаецца ўсё вышэй і вышэй. Трашчаць падставы фашысцкай дыктатуры. Недапамагае і люты крывавы тэрор, недапамагаюць і катаваньні на дэфэнзывах розных **садыстаў — Зарэмбаў, Кавальчукоў і інш. катаў.** На месца аднаго выбухнула з строю рэвалюцыянэра яго месца заступаюць дзесяткі сотні новых барацьбітоў за рабочую справу.

Першамайскія рэвалюцыйныя выступленьні пралетарыяту і працоўнага сялянства Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны пад сьцягамі кампартыі супроць фашысцкай дыктатуры, у абарону Савецкага Саюзу паказваюць на тую небясьпеку, якая пагражае польскаму фашызму ў выпадку яго нападу на першую ў сьвеце пралетарскую дзяржаву — СССР. Аднак, падрыхтоўка інтэрвэнцыі супроць СССР адбываецца паскоранымі тэмпамі. І вось, для задушэньня рэвалюцыйнага руху, асабліва на акупаваных Зах. Беларусі і Зах. Украіне — будучых плядармах вайны з Савецкім Саюзам, польскі фашызм зараз зьвяртаецца да новай правакацыі.

Так, напярэдадні 1 мая фашысцкі друк пашыраў «сэнсацыйнае» паведамленьне аб пакражы з вайсковага пягніка 6 скрынь вайсковай амуніцыі. Розныя фашысцкія друкоўцы, як «Кур'ер Чырвоны» і інш., «асьвядомленыя» газэты, з нахальным выглядам, згодна ўказаньняў ахранкі, заяўлялі, што гэту амуніцыю ўкралі камуністы, каб «наладзіць першамайскае крывапраліцьце». Гэта правакацыйнае паведамленьне было повадам для масавых арыштаў рэвалюцыйных рабочых і сялян, каб мець апраўданьне для адкрытых масавых расстрэлаў камуністычных дэманстрацый.

Далей «Газэта Варшаўска» ў нумары 137 ад 2 мая паведамляе аб замаху на чыгуначны мост на Бугу паміж станцыямі Малкіно і Седлецам, аб замаху на цягнік паміж ст. Семятычы і Дужэн. Адначасова і фашысцкі «Кур'ер Віленскі» ў нумары 99 падае аб бомбавым замаху на станцыю Падбродзьдзе. І вось фашысцкая прэса правакацыйна абвінавачвае ў арганізацыі гэтых тэрарыстычных актаў камуністаў. «Газэта-ж Варшаўска» нават піша: «Гэта дзейнасьць (тэрарыстычная) вядзецца ў паразуменьні з камуністычнай цэнтраляй, якая знаходзіцца па-за межамі Польшчы, па што ўлада бесьпячэнства (чытай ахранкі. Рэд.) мае адназначныя довады». Фашысцкая Польшча вядома ва ўсім сьвеце як краіна клясычнага белага тэрору і правакацыі. Імкнучыся на ўсіх парах да інтэрвэнцыі супроць СССР, польскі фашызм шляхам дзікага тэрору стараецца ачысьціць сабе тылы для будучай вайны. Нам добра памятны заявы розных фашысцкіх газэт аб тым, што «няхай толькі падсохне, няхай толькі пакажацца трава з-пад сьнегу» і г. д. І вось польскі фашызм, разграміўшы ўсе легальныя рабоча-сялянскія арганізацыі, якія хаця-б насілі цень рэвалюцыйнага характару, як напрыклад, **Беларускі клюб «Змаганьне», ППС-Лявіцу. Сялянскую самазапамогу, Аб'яднаны сельроб** і г. д. зараз шляхам правакацыі, каб знайсьці прадлог, імкнецца да новых пагромаў рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху, як у самой Польшчы, так і асабліва на акупаваных Зах. Беларусі і Зах. Украіне.

Правакацыйная кампанія фашысцкага друку па загадзе зьверху вакол усіх гэтых фактаў па тэрыторыі акупаванай Зах. Беларусі мае на мэце **падрыхтоўку новай крывавай «пацыфікацыі» Зах. Беларусі ў яшчэ больш шырокім маштабе, чым гэта было ў мінулым годзе на Зах. Украіне для адкрытага фізычнага зьнішчэньня авангарду пралетарыяту і працоўных мас — камуністычнай партыі Зах. Беларусі.**

Правакацыйная кампанія польскага фашызму не зьяўляецца выпадковым зьявішчам і чымсьці адарваным ад ліхаманкавай падрыхтоўкі інтэрвэнцыі супроць СССР. Сёнешняе радыё прынесла нам весткі, што галоўным урадавым намісарам Бэсарабіі назначан вядомы крывавы кат працоўных Бэсарабіі генэрал Наповіч. Гэта той самы генэрал, які ў 1918 годзе **акупаваў Бэсарабію і ўстанавіў там рэжым самага жорсткага тэрору і нацыянальнага прыгнечаньня. Гэта той самы генэрал, які ўталіў у крыві Татар-бунарскае паўстаньне, расстраляўшы 20 тыс. сялян.** Як вядома, акупаваная Бесарабія падобна да акупаванай Зах. Беларусі, зьяўляецца плядармам для румынскіх баяр у іх вайне супроць Савецкага Саюзу. Таму падобна да таго, як польскі фашызм у Зах. Беларусі і Зах. Украіне, і румынскія баяры **агёнм і мячом** ачышчаюць сабе плядарм і тыл на выпадак вайны з СССР у Бэсарабіі. Такім чынам, мы наглядаем **адзіны фронт польскага і румынскага фашызму нават у падрыхтоўцы сваіх тылоў для прысьпешанага ўзброенага нападу на СССР.**

Працоўныя БССР, гэтага фарпосту Савецкага Саюзу, павінны яшчэ больш піль на зьвярнуць свой узрок на Захад, каб у кожную хвіліну быць гатовымі даць адпор імпэрыялістычнай зграі, якая спрабуе перашкодзіць сацыялістычнаму будаўніцтву. Першамайскія дэманстрацыі ва ўсім сьвеце паказалі, што пралетарыят усяго сьвету, а тым больш Польшчы, пад кіраўніцтвам гэрайчай КПП гатоў да абароны Савецкага Саюзу — гэтай бацькаўшчыны працоўных усяго сьвету.

Крывавы першы май у Польшчы

Для душэньня і крывавых расправаў над першамайскімі рэвалюцыйнымі дэманстрацыямі ў Варшаве створан быў спэцыяльны штаб, які дэталёва выпрацаваў плян сваіх прац і меў пад сваім загадам усе паліцэйскія і ваенныя сілы гораду. Аднак, наперакор забароне і ня гледзячы на крывавы тэрор, па закліку кампартыі Польшчы па ўсім краі рабочыя і сяляне выйшлі на дэманстрацыі пад сьцягам камуністычнай партыі.

Афіцыйны орган підсудчыкаў «Газэта Польска» 3-V — 31 г. падае: **«дэманстрацыі 1 мая на тэрыторыі ўсяго краю пад камуністычным кіраўніцтвам мелі баявы характар. З боку «вывротовых» партый праявілася вялікая агрэсыўнасьць і баёвасьць...»**

1-га МАЯ Ў ВАРШАВЕ

Ва ўсім горадзе; асабліва ў рабочых раёнах, былі разьмешчаны паліцэйскія атрады, якія ў сваім распараджэньні мелі тэлефоны, аўтамабілі, газавыя бомбы і кулямёты. Увесь рух як трамвайны, так і аўтабусны спыніўся. Крамы закрыты. Выдан загад закрыць паркі Саскі, Красінскіх і Траўгута.

Не працавалі рабочыя наступных заводаў і фабрык: «Поніск», «Лільпоп», фабрыка Бормана, трамвайныя варштаты, чыгуначныя варштаты, фабрыка «Паравоз», «Норблін», фабрыка тэлефонных апаратаў, табачныя фабрыкі, дзяржаўная фабрыка зброі, «Друцянка», «Пянэр», «Браты Баркоўскія», «Гернэберга», «Бэзэт», «Мана», «Рогн», «Зелінскага», тэкстыльная на Волі, аўтамабільныя варштаты і г. д.

З самага ранку на Празе камуністычная дэманстрацыя ў значным ліку рушылася ў кірунку цэнтру гораду. На ліцыя накінулася на дэманстрантаў і хацела адабраць сьцяг. Адзін з паліцэйскіх паранены. На Тарговай і Валынскай, а таксама на Дзельнай, Кармэліцкай, на пляцы Жалезнай Брамы, на вуліцы Замэнгофа і Купецкай атрады паліцыі разганялі камуністычныя паходы, ужываючы агнястрэльную зброю і газы. На Маршалкоўскай вуліцы камуністычны паход прарваў кардон паліцыі і накіраваўся да пляцу Грыбоўскага. На Мілай і Валынскай вуліцах на камуністычную дэманстрацыю напала ўзброеная ў штурмовыя шаёмы і гранаты паліцыя і з усёй жорсткасьцю зьбівала і калечыла дэманстрантаў. На Карцэльскім пляцы на муніцыі арганізавалі мітынг. Прыбыўшая ў значным ліку конная паліцыя разагнала дэманстрацыю і арыштавала некалькі дзесяткаў чал. Па ўсім горадзе ў гэты дзень арыштавана некалькі сот чал. і некалькі дзесяткаў паранена. У ва многіх частках гораду на камуністычныя дэманстрацыі нападалі фашысцкія і сацыял-фашысцкія баёўкі з ППС і «Бунду» і стралялі ў дэманстрантаў, дапамагаючы паліцэйскім атрадам разганяць рэвалюцыйныя дэманстрацыі.

Паводле паведамленьня фашысцкага друку, апрача Варшавы, надзвычай бурныя першамайскія дэманстрацыі раболіся і па іншых гарадох Польшчы.

У ДАМБРОЎСКІМ БАСЭЙНЕ. 1 мая стаялі ўсе фабрыкі ў Сасновіцах. Адбыўся 3-тысячны мітынг рабочых. На мітынгу былі разгорнуты 6 камуністычных сьцягаў і транспарэнтаў. У часе выступленьняў крамоўцы заклікалі рабочых да барацьбы супроць пагрозы вайны, **на абарону СССР.** Рабочыя з энтузіязмам, уздымалі лёзунгі «няхай жыве СССР», «Прэч імпэрыялістычную падрыхтоўку фашызму для задушэньня бацькаўшчыны міжнароднага пралетарыяту, які будзе сацыялізм». Пасьля мітынгу рабочыя пакіраваліся паходам па вуліцах гораду. Паліцыя з усіх бакоў старалася разагнаць дэманстрантаў. Дэманстранты трымаліся вельмі стойка і адбівалі паліцэйскія атакі градам каменьняў. Паліцыя адкрыла стральбу, у часе якой **цяжка паранены 4 дэманстранты.** Пасьля абстрэлу арыштавана звыш 100 чалавек рабочых.

У Чэлядзі, Грудзёнцы, Пясткове адбыліся бурныя дэманстрацыі рабочых, пры чым ва ўсіх гэтых гарадох выступіла на вуліцу—па 2 тыс. чалавек. Дэманстрацыі былі разагнаны значнымі атрадамі паліцыі, прычым дэманстранты асабліва ў **Гоньдах** жорстка супраціўляліся, закідваючы паліцыю каменьнямі. Паліцыя параніла некалькі чалавек. Адбыліся два паходы ў **Скрыменчыцах і Казімеры,** дзе дэманстранты закідалі каменьнямі паліцэйскі бранявік. Паліцыя кулямётным агнём з бранявіка **цяжка параніла двох рабочых. У Парамцы** таксама адбылася бурлівая дэманстрацыя, якая некалькі разоў прарывала кардоны паліцыі.

У Лодзі. 1 мая на галоўным рынку адбыўся мітынг 6 тысяч рабочых. З прамовамі выступілі камдэпутат тав. **Данэцкі.** Паліцыя атакавала мітынг і разагнала яго. Камдэпутат Данэцкі быў зацягнуты ў браму аднаго з домоў і моцна зьбіты.

Асабліва бурныя і актыўныя дэманстрацыі прайшлі на Зах. Украіне. У Львове ў ноч з 30 красавіка на 1 мая за распаўсюджваньне адозваў і вывешваньне транспарантаў праведзены масавыя вобыскі. Арыштавана звыш 20 чалавек. Арышты працягваюцца. Працоўнае сялянства вёскі Зах. Украіны ў дзень 1 мая даказала сваю рэвалюцыйную гатоўнасьць дэманстраваць разам з рабочымі гораду. У **Маневічах** (Ковельская павета) на дэманстрацыю рэвалюцыйных сялян, арганізаваных «Сельробам», напаў валікі паліцэйскі атрад, які пачаў зьбіваць дэманстрантаў бізунамі і гумовымі палкамі. Сяляне арганізавалі самаабарону, закідваючы паліцыю камэньнямі **Разьюшаная паліцэйшчына дала некалькі залпаў, у выніку якіх 2 забітых і 3 параненых.** Дэманстранты ўшлі у лес і там знаходзяцца і да гэтай пары. Паміж паліцыяй і дэманстрантамі **ў Еэёрне дайшло да крывавай сутычкі; паранена 3 рабочых і 2 паліцэйскіх. У Голобах** (Ковельская павета) ў выніку сутычкі з паліцыяй **ёсьць шмат забітых і параненых сялян.** «Газэта Польска» паведамляе, што сяляне ў Ковельскім павеце, каб перашкодзіць дзейным палі

САУГАСНАЯ ПАРТ'ЯЧЭЙКА ПАВІННА БЫЦЬ У АВАНГАРДЗЕ

паходу за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, за поўнае выкананьне праграмы бальшавіцкай сяўбы

Узмацняць партработу ў саўгасах

Перад саўгасамі стаяць надзвычай адказныя вялікай палітычнай важнасьці задачы. Саўгасы павінны даць сапраўдныя ўзоры баявога выкананьня і перавыкананьня праграм бальшавіцкай сяўбы, павінны адыграць гіганцкую ролю ў справе разгортваньня калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Гэта абавязвае партыйныя ячэйкі саўгасных гаспадарак перабудаваць сваю работу так, каб забясьпечыць поўнае і своячасовае ажыцьцяўленьне асноўных палітычных задач партыі.

Між тым, рад матар'ялаў з месц гаворыць аб тым, што партработа ў радзе саўгасаў пастаўлена вельмі спаба. Асобныя ячэйкі абмяжоўваюцца работай толькі ўнутры саўгасу, невыстарчальна прымаюць удзел у рабоце на вёсцы. Рад парт'ячэек зусім спаба праводзяць работу па ажыцьцяўленьні пёзунгу сусьцільнай калектывізацыі, недапушчальна дрэнна мабілізуюць масы калгасьнікаў, беднаты і сераднякоў на ажыцьцяўленьне асноўных гаспадарча-палітычных кампаній.

Гэта ўсё абавязвае райпартарганізацыі аддаць больш увагі справе належнай пастаноўкі работы ў саўгасах. Папершае, парт'ячэйкі саўгасаў павінны так расставіць свае сілы, каб ахапіць партыйным кіраўніцтвам усе важнейшыя участкі гаспадаркі. Па-другое, ячэйка КП(б)Б саўгасу павінна больш своячасова і лепш, як да гэтага часу, мабілізаваць масы на ажыцьцяўленьне пляну гаспадарчага разьвіцьця і замацаваньня савецкіх гаспадарак. Такія пытаньні, як спэцыялізацыя саўгасаў, павышэньне таварнасьці (змаганьне за поўнае захаваньне маладняка, павышэньне ўдойнасьці кароў, якасьць работы на полі і на сенажаці) павінны стаць цэнтральнымі ў рабоце саўгаснай ячэйкі.

Саўгас зьяўляецца тым цэнтрам, вакол якога павінна разрастацца і разгортвацца калгаснае будаўніцтва. Між тым, рад партыйных ячэек саўгасаў недапушчальна дрэнна змагаліся за новыя калгасы, недапушчальна дрэнна кіравалі гаспадарчым замацаваньнем калгасаў. Турская, напрыклад, ячэйка зусім не займалася пытаньнямі калгаснага будаўніцтва, а капі ставілі гэтыя пытаньні, дык займалася імі фармальна, не дабівалася канкрэтных рэзультатаў.

Увядзеньне зьдзельшчыны ў калгасах, змаганьне за новы прыліў, за поўнае выкананьне праграм веснавой сяўбы — вось тыя пытаньні, якія павінны быць цэнтральнымі для саўгаснай ячэйкі ў яе рабоце па-за саўгасам.

Кіраўніцтва раённых партарганізацый павінны больш чым да гэтага часу займацца пытаньнямі партработы ў саўгасах з тым, каб дабіцца сапраўднага пераварэньня саўгасаў у апорныя пункты партработы на вёсцы.

У рабоце ячэйкі саўгасу „Палата" няма пералому

Каля 20 тысяч гэктараў плошчы пры станцыі Палата **Полацкага** раёну пуставалі, вякамі заставаліся нявыкарыстанымі. Балотная дрыгва, дробны хмызьняк, гнілыя карчы, рэдкая асака—вось усё «багацьце» гэтай вялізарнай плошчы.

Па ініцыятыве полацкіх кіруючых партыйных і савецкіх органаў у пачатку мінулага году на гэтай тэрыторыі арганізован саўгас. Работа па будаўніцтве гэтага саўгасу суправаджалася радам труднасьцяй: не хапала рабочай сілы для сэзоннай працы на мэліярацыі і раскарчоўцы, адсутнічала патрэбная колькасьць цягавай сілы і інш. Кулацкія элементы праводзілі шалёную агітацыю супроць саўгаснага будаўніцтва, імкнучыся зрабіць свой уплыў галоўным чынам на тую бядняцка-серадняцкую частку сялянства вакольных вёсак, зямельная плошча якіх часткова адыходзіла пад саўгас.

Такое становішча абавязвала раённае парткіраўніцтва аддаць максымальную ўвагу саўгасу, каб забясьпечыць пасьпяховае выкананьне вытворчых задач і мабілізацыю рабочых мас і бядняцка-серадняцкага сялянства вакольных вёсак на бязьлітасную барацьбу з кулацтвам. На справе-ж гэтай увагі ня было. Полацкі райком абмежаваўся толькі тым, што на працягу ўсяго мінулага году заслухаў даклад загадчыка саўгасу. Такім чынам, работа ў саўгасе была прадастаўлена самацёку. Вытворчая праграма мінулага году ня была выкананa. Невыкананьне гэтай праграмы раённае парткіраўніцтва тлумачыць аб'ектыўнымі прычынамі, а канкрэтных захадаў для узмацненьня саўгасу ня ўжывала.

Вось факты. Парт'ячэйка на працягу цэлага году была ў складзе толькі 3-х чалавек: загадчыка саўгасу, яго памочніка і аднаго рабочага, які зьяўляўся сакратаром ячэйкі. Ячэйка фактычна ніякай работы не праводзіла, не рэагавала на хваравітыя зьявішчы, якія мелі месца ў саўгасе. Праводзіліся ад выпадку да выпадку сходы ячэйкі, прымаліся сякія-такія пастановы, але нічога не рабілася ў справе мабілізацыі рабочых на практычнае ажыцьцяўленьне гэтых пастаноў. Рабочым таксама бязьдзейнічаў. Сацсаборніцтва і ўдарніцтва не знаходзіла ў саўгасе практычнага ажыцьцяўленьня. Самакрытыка сярод рабочых ня была разгорнута. У радзе выпадкаў глушылася рабочая ініцыятыва. Былы загадчык саўгасу **Вялюга** называў дурнем рабочага Гаўрова за тое, што ён прапанаваў зьмяніць кошоха Шуфаева, які нядбайна адносіўся да дадатковы матар'ял.

У выніку гэтага выбары прайшлі пры ніякай актыўнасьці працоўных, а ў Таташанскім польскім сельсавеце колькасьць калгаснікаў і беднаты ў складзе сельсавету зьменшылася параўнальна з мінулым годам.

На пасаду старшыні польскага сельсавету высунулі беларуса, які ў цяперэдняй сваёй рабоце скажаў нацыянальную палітыку партыі. Але гэта толькі адно са зьявеньняў ланцуга скажэньняў нацыянальнай палітыкі Хойніцкім раённым кіраўніцтвам.

У мінулым годзе ў польскай вёсцы Мархлеўск, Паселіцкага сельсавету, была закрыта польская хата-чытальня, якая вяла шырокую палітычна-асьветную работу. І зноў тугаголаве матываваньне: «Мархлеўск—ёсьць вёска кулацка-заможная». У вёску Таташню пасылаюць хатніка, які ня ведае польскай мовы, ніякай работы не вядзе. У выніку хата-чытальня пустуе.

Такія-ж факты маюць месца ў практычнай рабоце па калектывізацыі польскай вёскі. Стоячы на тым пункце гледжаньня, што польскія вёскі—кулацка-заможныя, у Хойніках нічога ня робіць для ўзмацненьня работы сярод польскай беднаты, каб такім чынам змагацца з апартуністычным самацёкам і арганізаваць новы прыліў у калгасы, каб ачысьціць існуючыя польскія калгасы ад кулакоў.

Хойніцкае кіраўніцтва ігнаруе пастанову кастрычніцкага пленуму аб тым, што: «У якасьці адпэй з важнейшых задач бліжэйшага перыяду пленум высоўвае разгортваньне калектывізацыі ў нацыянальнай вёсцы».

Апрача таго, у Хойніках моў месца цэлы рад «левых» заскокаў, як адміністраваньне, абкладаньне серадняковай індывідуальным падаткам і г. д.

Аднак, як гэта заўсёды бывае, адваротным бокам мэдалі «левых» заскокаў ёсьць заўсёды правая практыка. Так было і ў Хойніках. Дазваляючы сабе рад «левых» загібаў, некаторыя зьвены партыйных арганізацый праводзяць грубую правую практыку. Так група беднаты ў Таташні пад кіраўніцтвам члена партыі пекалькі месяцаў таму назад вынесла пастанову аб звароце з высылкі ўсіх кулакоў гэтай вёскі, якія былі высланы за контр-рэвалюцыйную работу. Прыклад ідзе зьверху: ад раённага кіраўніцтва, ад раённага выканаўчага камітэту, які ў адным са сваіх дакумантаў падзяляў кулакоў на «сацыяльна-бясьпечных» і «сацыяльна-небясьпечных».

У Хойніках не змагаюцца з вялікадзяржаўным шавінізмам. Аб чым, як не аб прымірэнчых адносінах кіраўніцтва да праяў вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, гаворыць той факт, што Хойніцкі радыё-вузел працуе выключна на расійскай мове, што работа ў канцылярыі цэлага раду сельсаветаў і раённых устаноў вядзецца на расійскай мове і што нацыянальныя саветы (польскі і яўрэйскі) працуюць не на іх роднай мове?

Газэта «Орка», якая выкрыла гэтыя скажэньні, зусім правільна падкрэсьлівае, што «Хойніцкі раённы камітэт партыі не мабілізаваў працоўных мас на змаганьне з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе і з шавінізмамі розных адценьняў, ён нядольны праводзіць ленінскай нацыянальнай палітыкі».

Найбольш выразнай ілюстрацыяй таго, як клясавы вораг выкарыстоўвае ў сваіх контр-рэвалюцыйных мэтах моманты скажэньня нацыянальнай палітыкі—зьяўляецца польскі калгас імя Дзяржынскага ў Буда-Кашалеўскім раёне.

Гэта адзін з буйнейшых польскіх калгасаў у Беларусі з плошчай каля 2 тысяч гэктараў. Гэты калгас сапраўды па-баявому правёў першую бальшавіцкую сяўбу, аднак пасьля, у сувязі з тым, што мясцовая партыйная ячэйка і раённы камітэт партыі закінулі работу сярод беднаты, становішча калгасу пачало пагаршацца.

Замест дапамогі калгасу, раённыя арганізацыі фактычна дапамагалі кулацтву разбураць яго. Ня гледзячы на бядняцка-серадняцкі склад калгасу (19,3 проц. батрацкі, 30,1 проц. бедняты), раён упарта лічыў калгас імя Дзяржынскага кулацкім.

Гэтыя скажэньні надзвычай умела выкарыстоўваў польскі кулак, які пачаў згуртоўваць вакол сябе калгаснікаў і надрыхтоўваць глебу для разбураньня калгасу.

Ганебныя выпадкі мы мелі ў вёсцы Храпкава, Хойніцкага раёну. Амаль кожны дзень адбываліся сходы ў гэтай вёсцы пад кіраўніцтвам кулака, на якіх новы. Па адным са сходаў была вынесена пастанова, каб забіць усю жывёлу. Усе палітычна-гаспадарчыя кампаніі ў гэтай вёсцы былі сарваны.

Усё гэта адарылася таму, што мясцовыя арганізацыі ня выправілі «левых» памылак мінулага году і не вялі работы сярод працоўных гэтай польскай вёскі, лічачы яе кулацка-заможнай.

Да гэтага часу невыстарчальна ажыцьцяўляецца партыйнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі пастанова Кастрычніцкага пленуму аб працы сярод рабочых наймншасьцяй.

У Менску, Віцебску, і іншых гарадох БССР, дзе на радзе прадпрыемстваў ёсьць значная колькасьць рабочых палякаў («Камунар»—Менск, «Дзьвіна»—Віцебск—160 чалавек, папяровая фабрыка—Віцебск—150 чал., «Мэтпрэм»—Віцебск—50 чалавек і г. д.) ніякай работы сярод іх не вядзецца. Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі гэтых прадпрыемстваў, ня гледзячы на тое, што дзе-ні-дзе на фабрыках існуюць нацыянальныя камісіі—апартуністычна адносяцца да гэтай работы. Вельмі слаба пастаўлена сярод рабочых-палякаў палітычна-асьветная і антырэлігійная работа.

За такое становішча справы ў значнай ступені адказвае ЦСПСБ, кіраўніцтва якога ў справе работы сярод наймншасьцяй у лепшым выпадку выявілася ў паперовых дырэктывах.

Раённыя нацыянальныя камісіі, на якія ўскладаецца вялікая работа на ажыцьцяўленьні нацыянальнай палітыкі, да гэтага часу ня ўсе па-баявому выконваюць дырэктывы кастрычніцкага пленуму УсеКП(б).

РК КП(б)Б і нацыянальная камісія пры ЦВК БССР павінны аддаваць больш увагі справе ўзмацненьня работы раённых нацыянальных камісій.

* * *

Мы маем вельмі вялікія дасягненьні ў рабоце сярод польскіх працоўных мас. **Узрастае актыўнасьць і ўдзел рабочых, беднякоў і сераднякоў-палякаў у сацыялістычным будаўніцтве. Узрастае колькасьць рабочых-палякаў, занятых у прамысловасьці. Усё вышэй узьнімаецца хваля прыліву польскіх бядняцка-серадняцкіх мас у польскія і інтэрнацыянальныя калгасы. Зараз ужо ў БССР колькасьць калектывізаванага польскага насельніцтва даходзіць да 30 проц.** Адначасова з гэтым шпарка пасоўваецца наперад будаўніцтва польскай культуры, сацыялістычнай па зьмесьце і нацыянальнай па форме. Па-вялічаецца сетка польскіх школ у БССР. Пачала ўжо працаваць польская сэкцыя пры Беларускім дзяржаўным універсытэце. У гэтым годзе адкрываюцца польская сэкцыя пры агранэдагагічным інстытуце, пры рабфаку ў Гомлі і г. д. Значная ўвага аддаецца пытаньню выхаваньня новых кадраў для работы сярод польскага працоўнага насельніцтва.

Усё гэта найлепш сьведчыць аб настойлівым праводзеньні КП(б)Б ленінскай нацыянальнай палітыкі паводле пастаноў XVI зьезду УсеКП(б).

Кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б падкрэсьліў, што: «Адпэй з форм праяўленьня вялікадзяржаўнага шавінізму зьяўляюцца таксама зьдзекі па адрасе нацыянальных меншасьцяй». Паданыя факты грубага скрыўленьня нацыянальнай палітыкі паасобнымі партыйнымі арганізацыямі ня можна інакш кваліфікаваць як праяўленьне ўхілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму.

КП(б)Б можа ажыцьцяўляць нацыянальную палітыку партыі толькі пры ўмове рашучай барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, мясцовым контр-рэвалюцыйным шавінізмам, у першую чаргу беларускім, а таксама шавінізмамі іншых колераў.

БССР у процілегласьці гэй трагічнай рэчаіснасьці, якую перажывае Заходняя Беларусь пад акупацыяй польскага фашызму, была, ёсьць і будзе сапраўднай бацькаўшчынай пралетарыяту і працоўных мас усіх нацыянальнасьцяй.

Прынц.

Цэнтральныя газэты БССР

праходзяць міма агляду—самаправеркі нізавога друку

Апублікаваная 4-га красавіка пастанова ЦК КП(б)Б абавязала ўсе гаркомы, райкомы КП(б)Б і рэдакцыі цэнтральных, гарадзкіх і раённых газэт правесьці масавы агляд-самаправерку нізавога друку **«пад кутом яшчэ большага павышэньня ролі і месца нізавога друку ў барацьбе за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі, за выкананьне прамфінпляну і за пасьпяховае правядзеньне другой бальшавіцкай вясны, за новы ўздым магутнай хвалі далейшага калгаснага прыліву, а таксама за няўхільнае ажыцьцяўленьне пёзунгу рабселькораўскага рух аб тым, што «кожны рабселькор—ударнік, кожны ўдарнік—рабселькор».**

Пастанова Сакратарыяту ЦК абавязала таксама:

«Рэдакцыі цэнтральных і раённых газэт шырока асьвятліць на сваіх старонках ход агляду-самаправеркі». Газэта «Рабочай» 4 красавіка побач са зьмяшчэньнем пастановы ЦК дае перадавы артыкул пад загалоўкам «Разгорнутым фронтам», у якім піша:

«...Яшчэ ў большай ступені, чым раней, лаўстала патрабаваньне аб забесьпячэньні апэрацыйнасьці і дзейснасьці матар'ялаў, што друкуюцца ў газэтах».

Артыкул канчаецца словамі:

«Варта памятаць, што ЦК абавязвае вас аддаць праверцы-агляду максымум увагі, бо «кожнае праяўленьне недаацэнкі палітычнага значэньня нізавога друку і рабселькораўскага руху павінна кваліфікавацца, як праяўленьне апартунізму на практыцы».

«Рабочай», добра пачаўшы агляд-самаправерку, робячы ўпор на неабходнасьці забесьпячэньня апэрацыйнасьці і дзейснасьці, заяўляе аб тым, што «пастанова ЦК абавязвае аддаць праверцы-агляду максымум увагі», сам, калі ня лічыць нядаўна зьмешчанага яшчэ адпаго перадавога артыкулу, ня робіць у сваёй далейшай рабоце таго, да чаго ён заклікае нізавы друк. Газэта «Рабочай», якая ў арсэнале сваёй масавай работы налічвае рад з «агэнтычкам» праведзеных значных масавых палітычных мерапрыемстваў, павінна зараз-жа, нахаду выправіць свой даволі буйны недахоп—яўна нездавальняючае асьвятленьне ходу масавага агляду-самаправеркі і ўсесьпіраўскай кампаніі перавыбараў рэдкалегій газэт.

Так, пасьля 4 красавіка, зьмяшчаючы амаль на цэлай старонцы ў № 89 ад 14 красавіка матар'ялы вынікаў рабкораўскага рэйду на г. Менску, газэта «Рабочай» у перадавіцы, дзе гаворыцца аб фактах заціску самакрытыкі, нерэагаваньні на рабкораўскія заметкі, слабым кіраўніцтве паасобных партыйных ячэек работай пасьценгазэт (музтэхнікум, абутковая фабрыка) ні словам ня зьвязвае гэтых фактаў з праходзячай самаправеркай-аглядам нізавога друку і падрыхтоўкай да ўсесьпіраўскага зьезду рабселькораў. Нават «шапка» «Заставіць «молчальника» заговорить», «Пралетарская грамадзкасьць патрабуе, каб «трыкутнікі» рэагавалі на рабкораўскія заметкі»—і тая ня зьвязвае рэйду з задачамі, пастаўленымі ЦК КП(б)Б у сувязі з самаправеркай нізавога друку, перавыбарамі рэдкалегій газэт і падрыхтоўкаю да ўсесьпіраўскага зьезду рабселькораў.

Тое-ж самае мы наглядзем і ў газэце № 92 ад 18 красавіка, дзе зьмяшчаецца падборка аб заціску самакрытыкі, аб тым, што ў Копысі пры райгрупкомах не працуюць пасьценныя газэты, аб тым, што пасьценгазэта ў племгасе «Крынкі» ня выходзіць паўгода.

У адпэй з заметак, данай у гэтай-жа падборцы, мы чытаем наступнае:

«Нельга сказаць, каб у Белдзяржснабе прасьпедвалі за крытыку, але на яе не зварачаюць увагі».

Мы ня ведаем, як можна інакш кваліфікаваць слабую ўвагу на допісы, як заціск самакрытыкі?

«Шапка» гэтай падборкі таксама ня зьвязвае ўсёй падборкі з самаправеркай, якая праводзіцца.

Да 20 красавіка ні адным словам газэта «Рабочай» не сказала аб самаправерцы і не напомніла аб ёй сваім чытачом.

Патрабуючы ад нізавога друку апэрацыйнасьці і арганізацыі мас, «Рабочай», які, паўтараем, у іншых пытаньнях дае і даваў бліскучыя прыклады масавай работы, сам, аднак, не праводзіў і не праводзіць ні апэрацыйнай, ні арганізацыйнай работы ў сувязі з масавым аглядам-самаправеркай нізавога друку.

* * *

«Савецкая Беларусь», зьмяшчаючы 4 красавіка пастановы ЦК КП(б)Б аб самаправерцы, камэнтуе іх у сваёй перадавой **«Кожны рабселькор—ударнік, кожны ўдарнік—рабселькор»**, у якой піша:

«Асноўнай формай рабселькораўскага руху на сучасным этапе зьяўляецца ўдарная брыгада».

Зусім правільна адзначаючы, што асноўнай формай рабселькораўскага руху на сучасным этапе зьяўляецца ўдарная брыгада, газэта павінна была сказаць аб тым, што гэта зусім не азначае адмаўленьня ад работы з рабселькорамадзіночкай, а, наадварот, азначае неабходнасьць уцягненьня рабселькора-адзіночкі ў работу ўдарных брыгад. Перадавы артыкул газэты «Савецкая Беларусь» правільна адзначае, што

«Кожны парткалектыў, кожная партыйная ячэйка, узброіўшыся пастановамі ўсесаюзнай нарады, павінны вакол іх практычнага выкананьня мабілізаваць рабселькораў і пісьвы друк на выкананьне баявых задач, якія паўсталі зараз перад кожным заводам і фабрыкай, саўгасам і калгасам, савецкай і гаспадарчай установай».

Мабілізуючы ўвагу на неабходнасьці **выкананьня** баявых задач у галіне партыйна-савецкага друку, газэта «Савецкая Беларусь» між тым і да гэтага часу сама нічога практычнага не зрабіла для таго, каб практычна выканаць тую ўстаноўку, якая дана ў перадавым артыкуле самой-жа «Савецкай Беларусі».

Да 20 красавіка амаль ні адзін гук, ні адзін радок у газэце «Савецкая Беларусь» не напамінае аб тым, што на БССР праходзіць масавы агляд-самаправерка, што праходзіць усесьпіраўская кампанія перавыбараў рэдкалегій газэт і што праз месяц павінен адбыцца ўсесьпіраўскі зьезд рабселькораў.

Зьмяшчаючы перадавы артыкул у № 89 ад 18 красавіка пад загалоўкам «Урокі сьмілавіцкай справы», газэта ні адным словам ня зьвязвае гэтых урокаў з аглядам-самаправеркай нізавога друку, такім чынам не мабілізуе масы на ажыцьцяўленьне задач, пастаўленых ЦК у сувязі з самаправеркай.

* * *

Газэта **«Калгасьнік Беларусі»** 6-га красавіка зьмясьціла пастановы ЦК КП(б)Б аб самаправерцы і перадавы артыкул **«Выканаць пёзунг—кожны рабселькор—ударнік, кожны ўдарнік—рабселькор».**

Газэта «Калгасьнік Беларусі» не адзначае практычных задач у справе актыўнага ўдзелу і арганізатарскай ролі селькора ў правядзеньні другой бальшавіцкай вясны, кантрактацыі, уздыме новай хвалі калгаснага прыліву.

Зьмяшчаючы ў № 52 ад 16 красавіка нешматлікі артыкул пад загалоўкам **«Нізавы друк у Рагачове на задворках»**, **«Калгасьнік Беларусі»** ня зьвязвае гэтага артыкулу з самаправеркай нізавога друку, якая праводзіцца.

З 6-га красавіка да 20 газэта моўчкі абыходзіць пытаньне аб самаправерцы нізавога друку.

* * *

«Чырвоная зьмена» зьмяшчае 4-га красавіка пастанову Сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб самаправерцы, аглядзе і камэнтуе яе ў перадавым артыкуле пад назвай **«Баявая задача»**.

Гэты перадавы артыкул ні адным словам ня высоўвае практычных задач перад масай юнкораў у галіне масавай работы ў сувязі з самаправеркай.

Абмежаваўшыся адным перадавым артыкулам, газэта «Чырвоная зьмена» фактычна поўнасьцю замоўчвае тую вялікую работу, якая праводзіцца пастаноў ЦК КП(б)Б зараз праводзіцца ў галіне друку.

Усе гэтыя факты выразна гавораць аб тым, што цэнтральны друк БССР надзвычай дрэнна ведае змаганьне за практычнае ажыцьцяўленьне задач, якія пастаўлены ЦК КП(б)Б перад друкам. Апошняя пастанова ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху з надзвычайнай выразнасьцю падкрэсьлівае задачы ўсёй партыйнай арганізацыі, задачы газэт, якія зьяўляюцца зброяй у руках партыі, у галіне работы сярод рабселькораў, узьнімцця рабселькораўскага руху, нізавога руху і партыйнага кіраўніцтва ім на вышэйшую ступень у адпаведнасьці з задачамі разгорнутага па ўсім фронце сацыялістычнага наступленьня, у адпаведнасьці з задачаю завяршэньня ў 1931 годзе пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў СССР. Уся работа на масавым аглядзе-самаправерцы работы нізавога друку, становішча рабселькораўскага руху і партыйнага кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеньнем усебеларускай масавай палітычнай кампаніі перавыбараў рэдкалегій пасьценных газэт і падрыхтоўкай да ўсебеларускага рабселькораўскага зьезду—арганічна, сустаўная частка барацьбы за прамфінплян, за гаспадарчы разрахунак, за ўпучыльненьня тэрміны пасеўнай кампаніі, за новую хвалю магутнага калгаснага прыліву.

Уся работа на аглядзе і падрыхтоўцы да перавыбараў рэдкалегій і да зьезду павінна праходзіць пад знакам яшчэ большага павышэньня ролі і месца нізавога друку і рабселькораўскага руху ў барацьбе за генэральную лінію, павінна праходзіць пад знакам выпраўленьня нахаду паяўных, часамі даволі значных недахопаў і далейшай перабудовы ўсяго рабселькораўскага руху і нізавога друку ў адпаведнасьці з тымі задачамі, якія пастаўлены ў пастанове ЦК УсеКП(б) аб рабселькораўскім руху.

Надыходзячае баявое сьвята пралетарскага друку—дзень 5-га мая—наш цэнтральны друк павінен адзначыць завастрэньнем увагі і забесьпячэньнем штодзённага кіраўніцтва і практычнай дапамогі нізавому друку і рабселькораўскаму руху.

Цэнтральныя газэты БССР павінны па-сапраўднаму павярнуцца тварам да ўсебеларускага масавага агляду-самаправеркі нізавога друку, перавыбараў рэдкалегій газэт і баявой, масавай, пасьпяхай палітычным зьместам падрыхтоўкі да ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

Аб аднэй з праяў вялікадзяржаўнага шавінізму

«Пленум зьвяртае сур'ёзную ўвагу ўсёй партыі на неабходнасьць рашучага пераломy ў абслугоўваньні нацыянальных меншасьцяй з боку партыйнага, савецкага і прафсаюзнага апарату».

(З рэзалюцыі Кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б).

Кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б крытыкуючы і акрэсьліваючы ўсебакова чарговае заданьне нацыянальнай палітыкі КП(б)Б, высунуў неабходнасьць рашучай і неаслабнай барацьбы з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, а таксама з шавінізмамі розных колераў.

Мабілізуючы ўвагу партыі на барацьбу з ухіламі ад ленінскай нацыянальнай палітыкі, пленум адначасова паказаў на значнае за апошні час аслабленьне работы сярод нацыянальных меншасьцяй і катэгарычна патрабаваў узмацненьня гэтай галіны работы.

Характарыстыка, якая дана Кастрычніцкім пленумам Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б становішчу работы сярод нацменшасьцяй, датычыць у значнай меры таксама і работы сярод польскага працоўнага насельніцтва. Цэлы рад партыйных арганізацый недаацэньваюць значэньня гэтай работы.

І па сёнешні дзень існуюць палітычна-шкодныя настроі аб тым, што работай сярод працоўнага польскага насельніцтва павінны займацца спэцыяльныя польскія работнікі. Паасобныя арганізацыі зразумелі, што адначасова з ліквідацыяй нацыянальных бюро пры парткамітэтах была ліквідавана таксама і работа сярод працоўных польскай нацыянальнасьці.

На пасаду старшыні польскага сельсавету высунулі беларуса, які ў цяперэдняй сваёй рабоце скажаў нацыянальную палітыку партыі. Але гэта толькі адно са зьвеньняў ланцуга скажэньняў нацыянальнай палітыкі Хойніцкім раённым кіраўніцтвам.

У мінулым годзе ў польскай вёсцы Мархлеўск, Паселіцкага сельсавету, была закрыта польская хата-чытальня, якая вяла шырокую палітычна-асьветную работу. І зноў тугаголаве матываваньне: «Мархлеўск—ёсьць вёска кулацка-заможная». У вёску Таташню пасылаюць хатніка, які ня ведае польскай мовы, ніякай работы не вядзе. У выніку хата-чытальня пустуе.

Такія-ж факты маюць месца ў практычнай рабоце па калектывізацыі польскай вёскі. Стоячы на тым пункце гледжаньня, што польскія вёскі—кулацка-заможныя, у Хойніках нічога ня робіць для ўзмацненьня работы сярод польскай беднаты, каб такім чынам змагацца з апартуністычным самацёкам і арганізаваць новы прыліў у калгасы, каб ачысьціць існуючыя польскія калгасы ад кулакоў.

Хойніцкае кіраўніцтва ігнаруе пастанову кастрычніцкага пленуму аб тым, што: «У якасьці адпэй з важнейшых задач бліжэйшага перыяду пленум высоўвае разгортваньне калектывізацыі ў нацыянальнай вёсцы».

Апрача таго, у Хойніках моў месца цэлы рад «левых» заскокаў, як адміністраваньне, абкладаньне серадняковай індывідуальным падаткам і г. д.

Аднак, як гэта заўсёды бывае, адваротным бокам мэдалі «левых» заскокаў ёсьць заўсёды правая практыка. Так было і ў Хойніках. Дазваляючы сабе рад «левых» загібаў, некаторыя зьвены партыйных арганізацый праводзяць грубую правую практыку. Так група беднаты ў Таташні пад кіраўніцтвам члена партыі пекалькі месяцаў таму назад вынесла пастанову аб звароце з высылкі ўсіх кулакоў гэтай вёскі, якія былі высланы за контр-рэвалюцыйную работу. Прыклад ідзе зьверху: ад раённага кіраўніцтва, ад раённага выканаўчага камітэту, які ў адным са сваіх дакумантаў падзяляў кулакоў на «сацыяльна-бясьпечных» і «сацыяльна-небясьпечных».

У Хойніках не змагаюцца з вялікадзяржаўным шавінізмам. Аб чым, як не аб прымірэнчых адносінах кіраўніцтва да праяў вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, гаворыць той факт, што Хойніцкі радыё-вузел працуе выключна на расійскай мове, што работа ў канцылярыі цэлага раду сельсаветаў і раённых устаноў вядзецца на расійскай мове і што нацыянальныя саветы (польскі і яўрэйскі) працуюць не на іх роднай мове?

Газэта «Орка», якая выкрыла гэтыя скажэньні, зусім правільна падкрэсьлівае, што «Хойніцкі раённы камітэт партыі не мабілізаваў працоўных мас на змаганьне з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе і з шавінізмамі розных адценьняў, ён нядольны праводзіць ленінскай нацыянальнай палітыкі».

Найбольш выразнай ілюстрацыяй таго, як клясавы вораг выкарыстоўвае ў сваіх контр-рэвалюцыйных мэтах моманты скажэньня нацыянальнай палітыкі—зьяўляецца польскі калгас імя Дзяржынскага ў Буда-Кашалеўскім раёне.

Гэта адзін з буйнейшых польскіх калгасаў у Беларусі з плошчай каля 2 тысяч гэктараў. Гэты калгас сапраўды па-баявому правёў першую бальшавіцкую сяўбу, аднак пасьля, у сувязі з тым, што мясцовая партыйная ячэйка і раённы камітэт партыі закінулі работу сярод беднаты, становішча калгасу пачало пагаршацца.

Замест дапамогі калгасу, раённыя арганізацыі фактычна дапамагалі кулацтву разбураць яго. Ня гледзячы на бядняцка-серадняцкі склад калгасу (19,3 проц. батрацкі, 30,1 проц. бедняты), раён упарта лічыў калгас імя Дзяржынскага кулацкім.

Гэтыя скажэньні надзвычай умела выкарыстоўваў польскі кулак, які пачаў згуртоўваць вакол сябе калгаснікаў і надрыхтоўваць глебу для разбураньня калгасу.

Ганебныя выпадкі мы мелі ў вёсцы Храпкава, Хойніцкага раёну. Амаль кожны дзень адбываліся сходы ў гэтай вёсцы пад кіраўніцтвам кулака, на якіх новы. Па адным са сходаў была вынесена пастанова, каб забіць усю жывёлу. Усе палітычна-гаспадарчыя кампаніі ў гэтай вёсцы былі сарваны.

Усё гэта адарылася таму, што мясцовыя арганізацыі ня выправілі «левых» памылак мінулага году і не вялі работы сярод працоўных гэтай польскай вёскі, лічачы яе кулацка-заможнай.

Да гэтага часу невыстарчальна ажыцьцяўляецца партыйнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі пастанова Кастрычніцкага пленуму аб працы сярод рабочых наймншасьцяй.

У Менску, Віцебску, і іншых гарадох БССР, дзе на радзе прадпрыемстваў ёсьць значная колькасьць рабочых палякаў («Камунар»—Менск, «Дзьвіна»—Віцебск—160 чалавек, папяровая фабрыка—Віцебск—150 чал., «Мэтпрэм»—Віцебск—50 чалавек і г. д.) ніякай работы сярод іх не вядзецца. Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі гэтых прадпрыемстваў, ня гледзячы на тое, што дзе-ні-дзе на фабрыках існуюць нацыянальныя камісіі—апартуністычна адносяцца да гэтай работы. Вельмі слаба пастаўлена сярод рабочых-палякаў палітычна-асьветная і антырэлігійная работа.

За такое становішча справы ў значнай ступені адказвае ЦСПСБ, кіраўніцтва якога ў справе работы сярод наймншасьцяй у лепшым выпадку выявілася ў паперовых дырэктывах.

Раённыя нацыянальныя камісіі, на якія ўскладаецца вялікая работа на ажыцьцяўленьні нацыянальнай палітыкі, да гэтага часу ня ўсе па-баявому выконваюць дырэктывы кастрычніцкага пленуму УсеКП(б).

РК КП(б)Б і нацыянальная камісія пры ЦВК БССР павінны аддаваць больш увагі справе ўзмацненьня работы раённых нацыянальных камісій.

* * *

Мы маем вельмі вялікія дасягненьні ў рабоце сярод польскіх працоўных мас. **Узрастае актыўнасьць і ўдзел рабочых, беднякоў і сераднякоў-палякаў у сацыялістычным будаўніцтве. Узрастае колькасьць рабочых-палякаў, занятых у прамысловасьці. Усё вышэй узьнімаецца хваля прыліву польскіх бядняцка-серадняцкіх мас у польскія і інтэрнацыянальныя калгасы. Зараз ужо ў БССР колькасьць калектывізаванага польскага насельніцтва даходзіць да 30 проц.** Адначасова з гэтым шпарка пасоўваецца наперад будаўніцтва польскай культуры, сацыялістычнай па зьмесьце і нацыянальнай па форме. Павялічаецца сетка польскіх школ у БССР. Пачала ўжо працаваць польская сэкцыя пры Беларускім дзяржаўным універсытэце. У гэтым годзе адкрываюцца польская сэкцыя пры агранэдагагічным інстытуце, пры рабфаку ў Гомлі і г. д. Значная ўвага аддаецца пытаньню выхаваньня новых кадраў для работы сярод польскага працоўнага насельніцтва.

Усё гэта найлепш сьведчыць аб настойлівым праводзеньні КП(б)Б ленінскай нацыянальнай палітыкі паводле пастаноў XVI зьезду УсеКП(б).

Кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б падкрэсьліў, што: «Адпэй з форм праяўленьня вялікадзяржаўнага шавінізму зьяўляюцца таксама зьдзекі па адрасе нацыянальных меншасьцяй». Паданыя факты грубага скрыўленьня нацыянальнай палітыкі паасобнымі партыйнымі арганізацыямі ня можна інакш кваліфікаваць як праяўленьне ўхілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму.

КП(б)Б можа ажыцьцяўляць нацыянальную палітыку партыі толькі пры ўмове рашучай барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, мясцовым контр-рэвалюцыйным шавінізмам, у першую чаргу беларускім, а таксама шавінізмамі іншых колераў.

БССР у процілегласьці гэй трагічнай рэчаіснасьці, якую перажывае Заходняя Беларусь пад акупацыяй польскага фашызму, была, ёсьць і будзе сапраўднай бацькаўшчынай пралетарыяту і працоўных мас усіх нацыянальнасьцяй.

Прынц.

Да III Усебеларускага зьезду чыгуначнікаў

Студзеньская адозва ЦК і СНК СССР аб чыгуначным транспарце дала разгорнутую праграму сац

ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНА—асноўны вагар ушчыльненьня тэрмінаў сяўбы

Сьледуйце прыкладу калгасаў Старасельскага сельсавету і саўгасу „Харапуць“, якія ўстанавілі скарочаныя тэрміны для правядзеньня вясновых палявых работ

Кожны калгасьнік павінен ведаць норму выпрацоўкі, ацэненую у працаднях

Правесьці сяўбу за 15 дзён

парашылі 19 ударных калгасаў Старасельскага сельсавету

КОПЫСЬ. (Наш кар.).

Усе 19 калгасаў Старасельскага сельсавету сустрэлі вясну добра падрыхтаванымі. Насенныя фонды ссыпаны і ачышчаны. Інвэнтар адрамантаваны. Цягавая сіла абагулена.

Калгасы сельсавету перайшлі на зьдзельшчыну. Арганізаваліся ўдарныя брыгады па асобных галінах працы. **Калгасы заключылі паміж сабой сацдагавор на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы, абавязаўшыся скончыць сяўбу за 15 дзён.**

Пераход на зьдзельшчыну выклікае нарастаньне калгаснага прыпліву. Так, у выніку пачатку сяўбы калгасамі «Пралетары», «Прагрэс» і «Наперад», якія перайшлі на зьдзельную сыстэму працы, **арганізаваліся два новыя калгасы.**

А. ГЕНІН.

ДА 20 МАЯ СКОНЧЫЦЬ СЯЎБУ

АБАВЯЗАЛІСЯ РАБОЧЫЯ САЎГАСУ „ХАРАПУЦЬ“

ГОМЕЛЬ.

Саўгас «Харапуць» разгарнуў палявыя работы. Ужо ўзарала 280 гэктараў пахаці. Засеяна аўса з вікай 10 гэктараў і раньняй бульбы 5 гэктараў.

Па пляне прадугледжваецца засеяць усяго 953 гэктары. **Рабочыя саўгасы, у парадку сустрэчнага пляну, абавязаліся давесьці яравы клін да 1.000 гэктараў і скончыць сяўбу да 20 мая.**

Каб выкапаць сваё абавязацельства, **рабочыя пастанавілі адмовіцца ад выхадных дзён, скарыстоўваючы дні адпачынку ў час непагоды.** Саўгас «Харапуць» выклікаў па сацыялістычнае спаборніцтва калгасы «Чырвоная Даліна» і «Перамога», Жгуньскага сельсавету.

Агульны сход саўгасу «Харапуць» пастанавіў перапазваць саўгас у гаспадарку імя тав. Ланге.

А. ШАБАЛІН.

Зьдзельшчына падвоіла прадукцыйнасьць працы

ВУШАЧЫ. (Наш кар.).

Зьдзельшчына дала добрыя вынікі ў тых калгасах, дзе на новую сыстэму працы былі пераведзены розныя галіны сельскай гаспадаркі.

У калгасе «Чырвоны ўсход» брыгада з 10-ці чалавек раней пры падзённай аплаце **намалочвала ў дзень 50-60 пудоў збожжа. Пасьля пераводу на зьдзельшчыну тая самая брыгада ўжо намалочвае 120 пудоў у дзень.**

У гэтым-жа калгасе раней **адзін чалавек дастаўляў у сьвінарнік 8-9 бочак вады за дзень, а зараз — 15-17 бочак,** па тых-жа конях.

У калгасе «Згода» ўвосень брыгада намалочвала 90 пудоў збожжа ў дзень. пасьля пераводу на зьдзельшчыну тая-ж брыгада намалочвае ўжо 250 пудоў у дзень.

Я. Ліпаўка, Я. Гінзбург.

70 процантаў *дае падзёншчына* ў саўгасе Бабруйскага ЦРК

БАБРУЙСК. (Па тэлефону).

У прыгарадным **саўгасе Бабруйскага ЦРК** да 3-га мая было засеяна яравымі 96,5 гэктараў і заарана 46 гэктараў.

Палявыя работы разгортваюцца вельмі марудна. Асноўная прычына ў тым, што да гэтага часу **саўгас яшчэ не пераведзен на зьдзельшчыну.** Ні прафэсыянальныя арганізацыі, ні шэфы не аказваюць належнай дапамогі. Не хапае рабочай сілы. **Становішча паглыбляецца тым, што з прычыны падзёншчыны моцна кульгае працоўная дысцыпліна.** 3-га мая, напрыклад, **прагулы на першым вучастку дасягнулі 70 проц.,** а па другім 50 проц.

А. Магідаў.

Першыя вынікі зьдзельшчыны

СЛУЦАК. Калгас «Чырвоны маяк» спаткаў вясну у поўнай падрыхтаванасьці. Насенныя фонды былі ссыпаны яшчэ за 10-та красавіка. Створаны таксама фуражныя фонды. Сельска-гаспадарчы інвэнтар — бораны, сявялкі і збруя адрамантаваны. **На 100 проц. выкананы плян кантрактацыі яравых.**

Цягавая сіла, інвэнтар і збруя прымацаваны да кожнага калгасьніка. У калгасе канчаткова ліквідавана абязлічка. Уся праца ў калгасе пераведзена на зьдзельшчыну.

Зьдзельшчына з першых-жа дзён яе ўвядзеньня дала добрыя вынікі, праца стала больш прадукцыйнай. Так, калі раней 40 кароў даілі чатыры даяркі, зараз гэту работу выконваюць трыо сьвіней раней даглядалі **тры чалавекі,** зараз гэту работу выконваюць **два калгасьнікі.** Увядзеньне зьдзельшчыны моцна ўдарыла па сымулянтах. Зараз з увядзеньнем зьдзельшчыны рабочая сіла разьмяркоўваецца па ўсіх галінах работы ў залежнасьці ад здольнасьці таго ці іншага калгасьніка. Так, моцныя калгасьнікі ідуць на больш цяжкую работу, а больш слабыя на больш лёгкую. На час сяўбы створана 5 спэцыяльных ударных брыгад.

Янка.

ПЕРШЫЯ ДНІ СЯЎБЫ *ПАКАЗАЛІ ПЕРАВАГІ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ*

ПІКЛОЎ. (Наш кар.).

Члены **калгасаў «Іскра» і «Пражэктар»** ужо у першыя дні сяўбы ўпэўніліся ў перавагах зьдзельшчыны. **Прадукцыйнасьць працы павялічылася ў паўтара-два разы параўнальна з мінулым годам, калі ў гэтых калгасах ужывалася падзёншчына.**

Са 100 калгасаў, якія ёсьць у раёне, на зьдзельшчыну перайшло ўжо 90. За апошнюю дэкаду арганізаваліся 3 новыя калгасы. Перадавыя калгасы узялі шэфства над адстаючымі.

Ян.

19 КАЛГАСАЎ ДАЎ *ДВУХДЭКАДНІК*

генэральнай праверкі

ПРАПОЙСК. (Па тэлеграфу).

У выніку двухдэкадніка генэральнай праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы па Прапойскім раёне **арганізавана 19 новых калгасаў.** У сельска-гаспадарчыя арцелі ўступіла **новых 1.064 гаспадарак.** Процант калектывізацыі ўзрос з 22,6 да 36. **Плян кантрактацыі выканан на 106,2 проц.**

Усе калгасы пачалі палявыя работы.

Старшыня Прапойскага РВК ГОФМАН.

На буксір адсталых

Калгас „Чырвоны партызан“ гатоў да выхаду ў поле

Калгас **«ЧЫРВОНЫ ПАРТЫЗАН»** (Лоеўскі раён) у баявой гатоўнасьці сустракае другую бальшавіцкую сяўбу.

У мінулым годзе пасьля перагібаў у калгасе засталося 13 гаспадарак, зараз калгас аб'яднае 62 бядняцка-серадняцкія гаспадаркі. 70 проц. в. Казіміраўка — у калгасе. Рост калгасу — вынік упартай барацьбы батракоў і беднякоў на чале з «25-тысячнікам» т. Марозавым.

Калгас ужо перайшоў на зьдзельную сыстэму работ, вылічаную ў працаднях. Зьдзельшчына шырока абмяркоўвалася на сходзе калгасьнікаў, якія высунулі устрэчныя калектыўныя нормы. Уся рабочая сіла [illegible] зьбіта на брыгады. Абмяркоўвалася ліквідавана — коні, брон і [illegible] цаваны на ўвесь год [illegible] калгасьнікамі.

Цягавая сіла калгасу ў добрым стане; на кожнага каня прыпадае апрацаваць ня больш 3 гэкт. Створаны брацінаваны кармавы фонд забясьпечвае коняй на ўвесь час сяўбы.

Уся рабочая сіла разьбіта па брыгадзе. На чале брыгад старыя калгасьнікі-ўдарнікі з былых батракоў і беднякоў.

Насеньне ачышчана і яго хопіць для засеву вызначанага яравога кліну. Нядаўна калгас арганізаваў пробны выезд у поле, які выявіў поўную яго гатоўнасьць да сяўбы. Старшыня калгасу т. Марозаў заклікаў калгасьнікаў стаць суцэльнай ударнай брыгадай і па-баявому змагацца за пярэдзельскім сельсавеце.

Калгас «Чырвоны партызан» узяў на грамадзкі буксір калгас «Шлях Леніна», які адстае з падрыхтоўкай да сяўбы.

М. Р.

МАСАВЫ ПРЫЛІЎ *дала зьдзельшчына* ў калгасе „Камунар“

ГРЭСК. (Наш кар.).

У выніку пераходу на зьдзельшчыну, ацэненую ў працаднёх, значна ўзрасла прадукцыйнасьць працы членаў калгасу «Камунар».

Так, да пераходу на зьдзельшчыну адзін **калгасьнік даглядаў 8 сьвіней, цяпер-жа даглядае 12 сьвіней і 5 цялят.**

Раней 3 чалавекі даглядалі 18 кароў. Пасьля ўкараненьня зьдзельшчыны **толькі 2 чал. даглядаюць 23 каровы і аднаго быка.**

Укараненьне зьдзельшчыны, ацэненай у працаднёх, выклікала прыліў у калгас. **Толькі за апошнія дні 36 адна-асобнікаў беднякоў падалі заявы аб жаданьні ўступіць у калектывы.**

Ц. МАКАРЭНКА.

Посадка цыбулі у прыгарадным гаспадарцы «Новы сьвет», Віцебскі ЦРК.

Выйшлі ў поле

БАБРУЙСК (па тэлеграфу).

Калгасы раёну распачалі сяўбу. Калгас «Пабеда» засеяў 3 гэкт. бульбы, калгас «Прасьвет» узараў 5 гэкт., калгас «Свабода» 3 гэкт. Адпаасобнікі таксама распачынаюць сяўбу.

Яцына.

ВЕТРЫНА. Калгас «Кастрычнік» поўнасьцю гатоў да веснавой сяўбы. У поле выехалі тры брыгады на 12 пар коняй.

Калгас „Кастрычніцкая рэвалюцыя“ пачаў палявыя работы

РАТАМКА.

3-га мая **калгас «Кастрычніцкая рэвалюцыя»,** Ратамскага сельсавету, Менскага раёну, **пачаў палявыя работы.** Калгасьнікі абвясьцілі сябе ударнікамі бальшавіцкай вясны і ўборачнай кампаніі.

У першы дзень сяўбы быў пасаджан адзін гэктар бульбы і ўзарана пад авёс 12 гэктараў.

НОРМЫ ВЫПРАЦОЎКІ перавышаюцца

ЕЛЬСК.

Большасьць калгасаў Вялікабокаўскага сельсавету перайшла на зьдзельшчыну. Ужо ў першыя дні сяўбы ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНА ДАЛА БЛІСКУЧЫЯ ВЫНІКІ. Норма ворыва адналяемешным плугом была ўстаноўлена ў 0,5 гэктараў. Гэта НОРМА ПЕРАВЫШАНА.

Пераход на зьдзельшчыну выклікаў прыліў амаль ва ўсе калгасы.

ЗЬМ. ВІШНЁВЫ.

Першамайскія 4 новыя калгасы

МЯЖА. (Па тэлеграфу).

За дні першамайскіх сьвят на раёне **арганізавана 4 новыя калгасы. У калектывы ўступіла 125 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.**

Райкалгасаюз — КАВАЛЁЎ.

Полаччына ўключылася ў сяўбу

ПОЛАЦАК. (Наш кар.).

Калгасы Бельскага сельсавету пачалі сяўбу. Напярэдня яны былі пераведзены па зьдзельшчыну, ацэненую ў працаднёх.

У ТРЫ ЗЬМЕНЫ ПРАЦУЮЦЬ ТРАКТАРЫ Жыткавіцкай МТС

ЖЫТКАВІЧЫ.

Масавая сяўба ў Жыткавіцкім раёне разгарнулася яшчэ ў дваццатых лічбах красавіка. На палявыя работы выйшлі і аднаасобнікі. Але ў некаторых сельсаветах сяўба затармазілася паводкай.

ПАЧАЛА СЯЎБУ І ЖЫТКАВІЦКАЯ МТС. ДВАЦЦАЦЬ ТРАКТАРАЎ, ЯКІЯ ПРАЦУЮЦЬ У КАЛГАСАХ, ПЕРАВЕДЗЕНЫ НА ТРОХЗЬМЕННУЮ РАБОТУ. У калгасах, якія абслугоўваюцца МТС, уведзена зьдзельшчына, ацэненая ў працаднёх. У сувязі з пачаткам сяўбы адзначаецца рост калгаснага прыліву. ЗА АПОШНІЯ ДНІ АРГАНІЗАВАЛІСЯ ДВА НОВЫЯ КАЛГАСЫ.

УЛЬЮЧЫК.

Скончыць закладку парнікоў

Праўленьне Белкалтасцэнтру адзначыла ў асобнай пастанове, што закладка парнікоў праходзіць слаба, прычым асабліва злачынна плян закладкі выконваецца барысаўскім і бабруйскім калгасаюзамі.

Праўленьне абавязала бабруйскі, барысаўскі, віцебскі, гомельскі, менскі і полацкі калгасаюзы забясьпечыць выкананьне дырэктыў Калгасцэнтру аб закладцы парнікоў. Канчатковым тэрмінам закладкі парнікоў вызначана 5 мая.

За невыкананьне дырэктыў па закладцы парнікоў абвешчаны вымовы старшыням бабруйскага і барысаўскага райкалгасаюзаў.

Фураж застаецца слабым вучасткам пасеўнай

БУДА-КАШАЛЕЎСКАЕ. 21 калгас Буда-Кашалеўскага раёну правялі пробны выезд у поле. Выезд паказаў падрыхтаванасьць калгасаў да сяўбы. Трактары і сельска-гаспадарчы інвэнтар адрамантаваны.

Слабым месцам большасьці калгасаў раёну зьяўляецца невыстарчальнае забясьпячэньне фуражом і грубымі кармамі.

Я.

Зьдзельшчына... у паштовай скрынцы

Кантрактацыя праводзіцца ў габінэтах

ЧАШНІКІ.

Кантрактацыя яравых яшчэ ня скончана ў Чашніцкім раёне. Асабліва адстае індывідуальны сэктар. **Асноўнай прычынай нездавальняючай работы па кантрактацыі зьяўляецца правааапартуністычная стаўка на самацёк, якая наглядаецца ў некаторых сельсаветах** (Лазухі, Асташова, Печаевічы). Райкалгасаюз у баку ад кантрактацыі. **Дагавары заключаюцца па калгасах габінэтным парадкам,** падпісваюцца старшынямі праўленьняў без папярэдняга шырокага абмеркаваньня на агульных сходах калгасьнікаў. **Пляны кантрактацыі не адпавядаюць плянам веснавой сяўбы.**

Яшчэ далёка ня скончана ажыцьцяўленьне вытворчых мерапрыемстваў да сяўбы.

Пераход на зьдзельшчыну адбываецца вельмі павольна. Да гэтага часу матар'ялы аб зьдзельшчыне яшчэ не атрыманы па калгасах. Увесь матар'ял, які быў прыслан з Менску, ляжаў на пошце і ня выкупляўся. Старшыня райкалгасаюзу Ліпскі аддаў загад не выкупляць яго. Толькі дзякуючы умяшальніцтву загадчыка раёна розныя інструкцыі і формы былі ўзяты з пошты.

Неабходна рашуча ўдарыць па апартуністычнай практыцы, якая наглядаецца ў рабоце некаторых раённых і низавых арганізацый.

Х. В.

Шкодніцкае плянаваньне

ТУРАЎ.

Кантрактацыя яравых па Тураўскім раёне **яшчэ ня скончана,** што тлумачыцца ў значнай ступені нездавальняючай работай райкалгасаюзу і райкалгасаюзу. Кожны з іх лічыць, што ў асноўным усю работу па кантрактацыі павінен праводзіць другі. Ніякай увагі ў рабоце адзначаных арганізацый няма. Дзейнасьць работнікаў, якія накіроўваюцца ў раёны, не кантралюецца.

Вялікую шкоду кантрактацыі прынесла блытаніна з плянамі напярэдняга пасеўнай плошчы. Так, дзякуючы «рабоце» пляновіка райкалгасаюзу **Стрыжэнова,** было запраектавана напярэдняе плошчы ў калгасах на 204 проц. Райаграном Рэзьнікаў ведаў аб гэтым, але маўчаў. Нечакаючы пакуль высьветліцца ўся гэта шкодніцкая аперацыя, райаграном уцёк.

Неабходна зараз-жа ліквідаваць рэзультаты гэтага шкодніцтва, каб на аснове правільна распрацаваных пляноў разгарнуць палявыя работы.

ЛАС.

Калгасьнікі ня ведаюць норм выпрацоўкі

БЯЛЫНІЧЫ. На 20-та красавіка з 72 калгасаў раёну на зьдзельшчыну пераведзены толькі 34 калгасы. Некаторыя калгасы падыходзяць вельмі фармальна да пераходу на зьдзельшчыну. Так, напрыклад, зачытваюцца нормы выпрацоўкі і ўсё. Пасьля прыняцьця норм выпрацоўкі, некаторыя калгасы працягваюць працаваць па-старому. Растлумачальная работы аб значэньні пераходу на зьдзельшчыну сярод калгасьнікаў не вядзецца. У выніку калгасьнікі ня ведаюць, чаму ўводзіцца зьдзельшчына, ня ведаюць, норм выпрацоўкі і ацэнкі норм у працаднёх.

Закон аб адзіным сельска-гаспадарчым падатку на 1931 год да гэтага часу не абгавораны і калгасьнікі аб ім нічога ня ведаюць.

Свой.

Пляны кантрактацыі не даведзены да вёсак

МЕЖА. Пляны кантрактацыі яравых пасеваў і сенажаці на раёне амаль сарваны. На 20 красавіка плян кантрактацыі выкананы толькі на 20,5 проц., прычым па адпаасобным сэктары толькі на 15-18 проц. На 7 сельсаветах пляны кантрактацыі толькі зараз даводзяцца да вёсак. На пленуме РВК, які адбыўся 15 красавіка высьветлілася, што амаль ні адзін сельсавет не даўёў пляну на кантрактацыі да насельніцтва.

Сельскія саветы ня лічаць патрэбным дапамагаць правядзеньню кантрактацыі.

Вызначаныя РВК упаўнаважаныя па сельсаветах мала ўвагі аддаюць выкананьню пляну кантрактацыі.

Прафсаюзныя арганізацыі ніякага ўдзелу ў правядзеньні кантрактацыі ня прымалі.

МЕЖАНЕЦ.

Толькі апартуністы ігнаруюць дырэктывы вышэйшых органаў

Прапанова Наркамзему СССР і інструкцыя Наркамзему БССР аб загатоўцы і скарыстаньні корму з гальля на мясцох не знайшла свайго адбітку. Кіраўнікі **Сіроцінскага раёну** абмежаваліся толькі тым, што гаварылі на тых ці іншых нарадах, пісалі цыркуляры і па гэтым па ставілі кропку. У выніку ні адзін калгас не загатаўляе і не скарыстоўвае гальлёвага корму. Работнікі зямельнага аддзелу тлумачаць бязьдзейнасьць на загатоўцы гальля недахватам рабочай сілы, таму яго і не загатаўляюць. Сьледам за раённымі работнікамі і калгасы не надаюць гэтаму пытаньню ніякага значэньня. Напрыклад, калгас **«XII Кастрычнік»** і **камуна імя Сталіна,** Сіроцінскага раёну, у сучасны момант знаходзяцца ў цяжкім становішчы з-за недахвату кармоў. Гэтыя калгасы нічога не зрабілі для таго, каб выкарыстаць драўляны корм і быць гатовымі да пасеўнай кампаніі. Такія адносіны да выкарыстаньня мясцовых кармавых рэсурсаў нельга інакш разглядаць як апартуністычнае ігнараваньне мерапрыемстваў вышэйшых органаў і вопыту перадавых калгасаў, якія пачалі ўжываць корм з гальля.

Яркім прыкладам праваапартуністычнай недаацэнкі загатоўкі грубых кармоў зьяўляецца Воркавіцкі раён, у якім калгас **імя Варашылава** ў зімовы час калі трох тыдняў ужываў корм з гальля прычым каровы і коні елі яго добра. Думка саміх калгасьнікаў была, што корм з гальля неабходна скарыстоўваць для таго, каб выйсьці гатовымі ў поле.

Зараз калгас імя Варашылава пакінуў ужываць гальлё на корм. Тлумачыцца гэта толькі тым, што раённае кіраўніцтва ня толькі не аддало колькі-небудзь увагі гэтаму пытаньню, але нават палічыла і лічыць, што корм з гальля—ня выхад з становішча.

Раённыя арганізацыі і калгасы павінны ўжыць самыя тэрміновыя захады для таго, каб арганізаваць масавы нахо за корм з гальля.

Практыка паказвае, што пры адсутнасьці грубых кармоў, корм з гальля дае магчымасьць замяніць сена і асабліва салому.

Ц—с.

Безгаспадарчасьць і нядбайнасьць перарастаюць у злачынства

КАСЬЦЮКОВІЧЫ. Каніцкі саўгас (сьвінагадоўчага напрамку) знаходзіцца ў пагражаючым становішчы. Безгаспадарчасьць назіраецца на кожным вучастку працы.

Будаўніцтва сьвінарнікаў сарвана. Выказка лесаматар'ялаў яшчэ не пачыналася і ніхто аб ёй ня думае.

З 1 красавіка ў саўгас накіравана 100 сьвіноматак, якія пастаўлены па 50 штук у адзін станок. Сьвіньні стаяць па калені ў вадзе.

З прычыны дрэнных умоў сьвіньні ёркшырскай пароды выраждаліся. Сьвіньні у несасьпелым перыядзе пускаліся ў злучку, што іх калечыла і зрабіла нягодными на плямя.

Такое-ж становішча і з буйной рагатай жывёлай. Ёсьць выпадкі захворваньня кароў на туберкулёз. Кіраўніцтва саўгасу ня ўжыло мер, каб ізаляваць гэтых кароў.

Саўгас на сёньняшні дзень не ўкамплектаван патрэбнай рабочай сілай.

Аплата рабочых робіцца па старым перапапататковых стаўках. Адсутнічае ўлік працы.

Дырэктар саўгасу Рахманаў не зварачае ўвагі па ўсе гэтыя недахопы і не ўжывае мер для іх ліквідацыі.

ВАПНА.

„Тэхніка ў пэрыяд рэканструкцыі вырашае ўсё“ (Сталін)

Пачынаем двухдэкаднік самаправеркі АЎЛАДАНЬНЯ ТЭХНІКАЙ

Выявіць лепшыя прыклады работы, лепшыя мэтады аўладаньня тэхнікай, выкрыць прычыны, якія тармозяць ажыцьцяўленьне лёзунгу тав. Сталіна

Рабкоры, ударнікі, уключайцеся ў праверку, арганізуйце масавы рух за аўладаньне тэхнікай!

Усім гарадзкім і раённым КК-РСІ, райкомам ЛКСМБ, гарадзкім і райпрафсаветам

ЦКК НК-РСІ РАЗАМ З ЦК ЛКСМБ І ЦСПСБ ПРАВОДЗІЦЬ ПРАВЕРКУ АРГАНІЗАЦЫІ СПРАВЫ НА АЎЛАДАНЬНІ ТЭХНІКАЙ. ПРЫ ЦКК НК-РСІ АРГАНІЗОВАН ШТАБ НА ПРАВЯДЗЕНЬНІ **ДВУХДЭКАДНІКА САМАПРАВЕРКІ** АРГАНІЗАЦЫІ СПРАВЫ ПА АЎЛАДАНЬНІ ТЭХНІКАЙ У БССР, У ЯКІ УВАХОДЗЯЦЬ ПРАДСТАЎНІКІ ЦКК НК-РСІ БЕЛ., ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ, І РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТ **«ЗЬВЯЗДА», «РАБОЧИЙ» І «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА».** ЗАДАЧАЙ ШТАБУ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ДАПАМОГА МЯСЦОМ У АРГАНІЗАЦЫІ САМАПРАВЕРКІ І ПАДВЯДЗЕНЬНЯ АГУЛЬНЫХ ВЫНІКАЎ НЕ ДЛЯ ЦСПСБ.

ДЛЯ ЛЕПШАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ САМАПРАВЕРКІ НА МЯСЦОХ У РАЁНАХ ТАКСАМА ТРЭБА АРГАНІЗАВАЦЬ АНАЛЁГІЧНЫЯ ШТАБЫ З ПРАДСТАЎНІКОЎ ГАРАДЗКІХ І РАЁННЫХ КК-РСІ, ПРАФСАВЕТАЎ, ГАРРАЙКОМАЎ, ЛКСМБ І РЭДАКЦЫЙ РАЁННАГА І ГАРАДЗКОГА ДРУКУ. ШТАБЫ ПАВІННЫ ПРАСАЧЫЦЬ ЗА АРГАНІЗАЦЫЯЙ САМАПРАВЕРКІ НЕПАСРЭДНА НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ І ДАПАМАГЧЫ Ў РАБОЦЕ, СКЛАСЬЦІ ВЫВАДЫ ПА РАЁНЕ-ГОРАДЗЕ ДЛЯ ПАСТАНОЎКІ ПЫТАНЬНЯ НА ПРЭЗЫДЫУМЕ ГАРАДЗКОГА РАЁННАГА КК-РСІ І ГАРПРАФСАВЕТУ.

АГУЛЬНЫЯ ВЫНІКІ І ПАСТАНОВЫ ГАР. РАЙКК РСІ І ПРАФСАВЕТАЎ ПА ГЭТЫМ ПЫТАНЬНІ ПАВІННЫ БЫЦЬ ДАСЛАНЫ ДА 30 МАЯ Ў ЦКК РСІ БЕЛ. НА ІМЯ ЦЭНТРАЛЬНАГА ШТАБУ ПА ПРАВЕРЦЫ АРГАНІЗАЦЫІ СПРАВЫ АЎЛАДАНЬНЯ ТЭХНІКАЙ.

СТАРШЫНЯ ЦКК І НАРКОМ РСІ БЕЛ. **КАЛНІН.**

СТАРШЫНЯ ЦСПСБ **РЫЖОЎ.**

САКРАТАР ЦК ЛКСМБ **ГУТКІН.**

Увагу стандарту!

Шырокая пралетарская грамадзкасьць яшчэ добра не ўяўляе сябе значэньне гэтай вялікай справы. ОСТ—работа знаходзіцца яшчэ, як быццам, у падпольлі. ОСТ—гэта «образец Стандарта». Стандарт (па—ангельску—прылад або норма) вызначае сабой: разьмер, вагу, абём, тэмпэратуру, склад сырцу, час апрацоўкі фабрыкатаў і іх паасобных частак, а таксама вызначае і спосабы ходу апрацоўкі (мэтады вытворчага працэсу),—каранёй кажучы, усё тое, што датычыць формы і якасьці вырабу.

Добра распрацаваны ОСТ дае хуткі тэмп, лепшую якасьць, эканоміць сілы, зьніжае сабекошт. Такім чынам, аснова стандарту—эканомія і яшчэ раз эканомія сіл, часу, сродкаў.

Змаганьне **за тэхніку**—гэта змаганьне за якасьць, за эканомію, за зьніжэньне браку, але гэта ня можа быць праведзена **без стандарту.** Стандарт загадзя падказвае інжынэру і майстру і кожнаму рабочаму, што дакладна ён павінен рабіць. Арганізатар—гаспадарнік і прыемшчык—бракаўшчык павінны ведаць наперад, якая якасьць прадукцыі патрэбна. На гэта яны знойдуць адказ **у стандарце,** пабудаваным на ўліку апошніх дасягненьняў замежнай і нашай тэхнікі, не выпускаючы з-пад увагі сёньняшнее наша тэхнічнае абсталяваньне і уменьне працаваць. Стандарт не зьяўляецца нормай, вызначанай раз—на заўсёды. Ён можа і павінен відазьмяняцца разам з дасягненьнямі тэхнікі.

Кожны прафіплян павінен быць цэмэнтаваны пэўнымі вымаганьнямі якасьці вырабу. Нашы пляны ідуць ня толькі зьверху, але ў форме сустрэчнага творчага масавага руху зьнізу, з вытворчасьці, пачынаючы з ініцыятывы кожнага рабочага і зьбіраючы вопыт мільёнаў. **Кожнаму рабочаму трэба ведаць ОСТ-ы яго вытворчасьці.** Толькі тады ён зможа ў парадку сустрэчнага вылучыць на зьмену старому ОСТ'у, старому стандарту—новы стандарт, новае палепшаньне.

Шмат рабочых ад варштату, якія вырабляюць тую ці іншую рэч, ня ведаюць, ні ёсьць на заводзе для яе пэўны стандарт. У сакавіку гэтага году Саюзны ўрад уключыў у крымінальны кодэкс новы артыкул: **асобы, адказныя за выпуск у зварот тавараў, выпрацаваных без захаваньня ОСТ'аў, павінны быць па суду пазбаўлены волі да двух год.**

ОСТ'ы распрацоўваюцца Усесаюзным **камітэтам па стандартызацыі пры Дзяржпляне СССР.** У бягучым годзе разгортваецца шырокае наступленьне стандартаў у прамысловасьць. **Беларускі камітэт па стандартызацыі** пачаў сваю дзейнасьць ня так дўно. Першыя весткі сьведчаць аб тым, што рад гаспадарных арганізацый, прамаб'яднаньняў уводзяць у вытворчасьць свае ўзоры прадукцыі камэрцыйна выгадныя для іх, але абыходзячы ОСТ'ы, навукова распрацаваныя і зацьверджаныя Усесаюзным камітэтам па стандартызацыі, і **абавязковыя для ўсёй вытворчасьці.** Трэба зразумець, што без паваротту нашага кіраўніцтва да пытаньняў стандартызацыі бяз простага прызнаньня і зразуменьня яе кіруючай ролі ў сацыялістычнай вытворчасьці—няма і таго паваротту да тэхнікі, якога патрабуе жыцьцё краіны. Ня будзе памылковым сказаць, што ў справе стандартызацыі існуе ігнараваньне грамадзкага ўплыву, г. зн. прыцягненьня рабочых мас да пытаньняў пабудовы і ўкараненьня стандарту.

У трэцім рашаючым годзе пяцігодкі на кожным заводзе асабліва завастраецца пытаньне **аб барацьбе са стратамі.** У гэтым вялікая роля належыць стандарту, бо ОСТ вымагае пэўнай якасьці, заклікае рабочага падвоіць сваю ўвагу. Пры дапамозе стандарту мы зможам зьнізіць колькасьць браку, пры дапамозе стандарту мы прад'явім рахунак прагульшчыку.

Трэці рашаючы год пяцігодкі адзначыўся пабудовай пляну стандартызацыі, пляну першачарговых мерапрыемстваў у гэтым напрамку. Трэба зрабіць так, каб стандарты сталі рэальным дасягненьнем на вытворчасьці, каб была ўстаноўлена норма якасьці, ніжэй якой нельга выпускаць прадукцыю.

Кожны рабкор, ударнік, юнкор, майстар, рацыяналізатар павінны аддаць асаблівую ўвагу стандартызацыі. У нашай краіне няма непераможных перашкод.

Партыя заклікае рабочую клясу да заваяваньня тэхнікі. **Першым крокам да аўладаньня тэхнікай зьяўляецца аўладаньне ўзорам стандарту тэй рэчы, якую ты сваімі ўпэўнымі рукамі робіш.**

Пры дапамозе стандартаў рашуча павесьці змаганьне са стратамі, марнатраўствам. Рабочыя ячэйкі па стандартызацыі павінны зьявіцца першай тэхнічнай школай непасрэдна на вытворчасьці і ўзяцца за праверку выкананьня стандартаў, за вывучэньне магчымасьцяй далейшага палепшаньня ОСТ'аў.

За сустрэчны стандарт! За бальшавіцкую якасьць!

Беларускі камітэт па стандартызацыі пры ЭКАНА БССР.

ПРАГРАМА ПРАВЕРКІ

1. Назва прадпрыемства, месца знаходжаньня, колькасьць рабочых і служачых.

2. Ці даведзена да кожнага рабочага прамова **тав. Сталіна** на канфэрэнцыі гаспадарнікаў і пастанова прэзыдыуму ЦСПСБ аб аўладаньні тэхнікай і як праводзілася папулярызацыя.

3. Якія мерапрыемствы прадпрынятыя ў сувязі з гэтым на лініі гаспадарчых, прафсаюзных, партыйных і камсамольскіх арганізацый.

4. Колькі арганізавана вытворча-тэхнічных гурткоў і курсаў, колькі імі ахоплена рабочых, адміністрацыйна-гаспадарчага і тэхнічнага пэрсаналу, колькі арганізавана гурткоў па асобных прафэсіях, забясьпечанасьць кіраўнікамі і павуковымі прыладамі, іх мэтавая ўстаноўка і па якіх праграмах займаюцца, колькі ў гэтых гуртках камсамольцаў і партыйцаў.

5. Ці ёсьць на прадпрыемстве рацыяналізатарскае бюро або рацыяналізатар, «БРИЗ» (бюро рабочага вынаходніцтва), колькі ў іх вызваленых працаўнікоў, якую дапамогу яны аказваюць рабочым вынаходцам.

6. Ці ёсьць у бібліятэцы-чытальні кіёск, перасоўкі, кніганошы, тэхнічная літаратура, на колькі даступна пабыльцё, ці ёсьць выстаўкі тэхнічнай літаратуры, рэкамэндавальныя сьпісы чытальнасьць у процантах.

7. Што робіцца клюбамі і чырвонымі куткамі па аўладаньні тэхнікай, колькі прачытана лекцый, дакладаў па вытворчым тэмы.

8. Якое адлюстраваньне знайшла пытаньне аб аўладаньні тэхнікай у пасьцегазэтах, шматтыражках у плякатах і лёзунгах.

9. Ці арганізаваны на прадпрыемствах кансультацыйна-даведачныя бюро, які ўдзел прымае інжынэрна-тэхнічная сэкцыя, інжынэрна-тэхнічны работнікі ў вытворчай асьвеце (кіраўніцтва гурткамі ў якасьці выкладчыкаў, складаньне праграм заняткаў кансультацыя і дапамога рабочаму вынаходніцтву).

10. Ці арганізаваны ячэйкі таварыства «Тэхніка масам».

11. Якую работу праводзяць тэхнікумы і вышэйшыя навучальныя ўстановы, іх сувязь з прадпрыемствамі, што робяць студэнты, прымацаваны да прадпрыемстваў, іх дапамога ў аўладаньні тэхнікай.

12. Якія ёсьць перашкоды ў рабоце па аўладаньні тэхнікай, меры пітрымаюцца да іх зьнішчэньня.

Праверку зрабіць масавай

УСІМ ЯЧЭЙКАМ КП(б)Б, ЛКСМБ І ФАБЗАЎКОМАМ

Выкананьне пёзунгу—дагнаць і перагнаць у тэхнічна-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны—немагчыма без аўладаньня тэхнікай найшырэйшымі масамі рабочае клясы.

Заклік тав. Сталіна і дырэктыва ЦСПСБ ставяць перад партыяй і рабочай клясай гэту задачу ва ўсю шырыню, яна павінна быць выканана ў найкарацейшы тэрмін. Узьняцьце кваліфікацыі без адрыву ад вытворчасьці, пры належнай увазе з боку партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх і гаспадарчых арганізацый павялічыла ўздым рабочага вынаходніцтва і ініцыятывы для вырашэньня вялізарных задач, што стаяць перад рабочай клясай, якая будуе сацыялізм.

ЦКК-НК РСІ Бел., ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ праводзяць масавую праверку арганізацыі працы па аўладаньні тэхнікай на прадпрыемствах. Праведзены ў красавіку месячнік паходу за аўладаньне тэхнікай даў дадатнія выніні. ПРАВЕРКА павінна яшчэ больш мабілізаваць увагу рабочых і арганізацый на неабходнасьць аўладаньня тэхнікай, замацаваць дасягненьні, выявіць перашкоды, вызначыць і ажыцьцявіць мерапрыемствы для іх зьнішчэньня.

З атрыманьнем гэтага вам неабходна тэрмінова правесьці самаправерку становішча справы па аўладаньні тэхнікай на вашым прадпрыемстве ў адпаведнасьці з прыкладзенай пры гэтым рабочай праграмай. Для правядзеньня гэтай работы трэба склясьці БРЫГАДЫ з прадстаўнікоў ячэек КП(б)Б, ЛКСМБ, фабзаўмясцкомаў, шматтыражкі, насьценгазэты, гаспадарнікаў, ударнікаў і лёгкай кавалерыі.

**Вынікі праверкі абмеркаваць на агульным сходзе або на шырокіх рабочых канфэрэнцыях з прыцягненьнем адміністрацыйна-тэхнічн

ПЕРШАМАЙСКІЯ СЬВЯТЫ

НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ, У КАЛГАСАХ І САУГАСАХ БССР

выліліся ў баявы агляд барацьбы за прамфінплян і падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны

І 2 мая павялічыліся сталёвыя калёны ўдарнікаў, узрос лік ударных брыгад і вытворчых камун

Пад знакам барацьбы за пяцігодку

(Ад нашага карэспандэнта)

Сьвяткаваньне 1 мая і другой гадавіны сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў Талінскім раёне прайшло з вялікім размахам. Рабочыя і працоўныя Аршанчыны дэманстравалі сваю адданасьць генеральнай лініі партыі, гатоўнасьць вучыцца змагацца за пяцігодку.

На **Сталінбудзе** ахоплена ўдарніцтвам 90 проц. усіх рабочых. Зьніжаны цяпер працяг прастояў—з 3 гадз. 45 мін. у сьнежні—да 46 мін. у красавіку. Павялічана падача торфу з 4 да 8 вагонаў у гадзіну.

Рабочыя Сталінбуду дапамагаюць у стварэньні калектывізацыі і падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Ударныя брыгады Сталінбуду адгрузілі ў Сталінскім сельсавеце 66 коў, 6 спружынных борон і г. д. На першамайскіх сьвят **35 лепшых ударнікаў падалі заявы аб уступленьні ў ленінскую партыю. Камсамольскія арганізацыі перадалі ў парт. 21 камсамольца.**

Рабочыя і інжынэрна-тэхнічны пэрсанал Сталінбуду заяўляюць партыі, што прыкладуць усе сілы, каб на яшчэ большых посьпехаў на фронце барацьбы за прамфінплян, за пяцігодку ў чатыры гады. Рабочыя адгукнуліся з заклікам да ўсіх прадпрыемстваў Аршанчыны прыняць меры да пашырэньня вытворчасьці, яшчэ большага ўзмацненьня барацьбы за прамфінплян. Гэта дасьць магчымасьць Белдрэсу працаваць з поўнай нагрузкай.

Рабочыя аршанскага ільна-камбінату адказ тульскім рабочым мабілізавалі сябе на ліквідацыю прарываў першага кварталу. Арганізаваны новыя ўдарныя брыгады імя «518» і «1040».

Рабочыя ільна-камбінату заключылі сацдагавор з работнікамі Рыскага прадстаўніцтва Усесаюзнага аб'яднаньня «Экспартлён». Рабочыя абавязаліся павысіць якасьць часальнагальну і ачоскаў па строга стандартным тыпе і патрабуюць ад работнікаў прадстаўніцтва прадаваць іх прадукцыю з большым эфэктам, памешыць гандлёвыя выдаткі на 20 проц.

Рабочыя службы цягі МББ адказваюць тульскім рабочым масавым уступленьнем у партыю. Да першамайскіх дзён **35 лепшых ударнікаў падалі заявы аб уступленьні ў рады КП(б)Б.** Рабочыя службы цягі абавязаліся замацаваць на вузле спарную язду і выпусьціць звыш пляну з рамонту 20 вагонаў і 3 паравозы.

Члены калгасу «Чырвоны партызан», Кудаеўскага сельсавету, высунулі сустрэчны плян пашырэньня плошчы яравога кліну—да 55 гэкт., стварылі выстарчальныя кармавыя фонды і поўнасьцю забясьпечылі сяўбу гатунковым і ачышчаным насеньнем.

Члены калгасу «Сталіна» абяцаюць скончыць веснавую сяўбу на тры дні раней вызначанага тэрміну. У калгасе разгортваецца сацспаборніцтва і ўдарніцтва, арганізуюцца ўдарныя брыгады імя «1040».

Л. К.

Калёна фізкультурнікаў на дэманстрацыі.



Камсамольская вытворчая камуна № 2 імя «518» заводу імя Варашылава.

Баявому штабу сацыялістычнага будаўніцтва—ЦК КП(б)Б

МАР'ІНА-ГОРКА. Урачысты сход рабочых **саўгасу Віленьсінча** і калгасьнікаў, прысьвечаны Міжнароднаму дню пралетарскай салідарнасьці—1 мая і гадавіне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, ішле гарачае прывітаньне баявому штабу сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР—ЦК КП(б)Б. На наш саўгас партыяй і ўрадам усклады вялікія задачы ў галіне вырашэньня мясной праблемы. Прарыў, які меў месца ў нас некалькі месяцаў назад, зараз пасьпяхова ліквідуецца, дзякуючы разгорнутым сацыялістычным мэтадам працы—сацспаборніцтву і ўдарніцтву.

1 мая саўгас перайшоў на зьдзельшчыну. Ужо прыступілі да сяўбы.

Імпэрыялісты і сацыял-фашысты рыхтуюць інтэрвэнцыю супроць нашай пралетарскай краіны. Мы заяўляем, што гатовы ў любую хвіліну стаць на абарону Кастрычніцкіх заваёў, на абарону адзінай ў сьвеце бацькаўшчыны працоўных.

Няхай жыве 1 мая! Няхай жыве КП(б)Б і яе бальшавіцкі ЦК!

***

МАГІЛЕЎ. Рабочыя-чыгуначнікі Магілеўскага вузла шлюць шчырае прывітаньне Цэнтральнаму Камітэту КП(б)Б і заяўляюць яго ў тым, што кантрольныя лічбы другога кварталу будуць рабочымі вузла з посьпехам выкананы і перавыкананы.

Мы выпускаем сёньня з абточкі паравоз адрамантаваны звыш пляну. Гэта—наш падарунак у дзень міжнародняй пралетарскай салідарнасьці.

Новыя калёны ўдарнікаў

БАБРУЙСК. (Наш кар.).

Першамайскія сьвяты прайшлі пры вялікім уздыме і энтузіязьме працоўных мас. 30-га красавіка на ўсіх прадпрыемствах адбыліся ўрачыстыя вечары, прысьвечаныя Міжнароднаму Дню Пралетарскай Салідарнасьці. У гэты-ж дзень адбыўся пашыраны ўрачысты пленум Бабруйскага гарсавету.

1-га мая, ня гледзячы на дрэннае надвор'е, адбылася шматтысячная дэманстрацыя рабочых і працоўных Бабруйску. Наперадзе калён ішлі прадпрыемствы, якія выканалі і перавыканалі прамфінпляны першага кварталу: ФАБРЫКА «ЧЫРВОНЫ ХАРЧАВІК», ШЧАЦІННАЯ ФАБРЫКА, ДРУКАРНЯ, ЛЕСАЗАВОД № 6.

На пляцы адбыўся парад часьцей Чырвонай арміі. Пасьля параду рабочыя арганізацыі наведалі падшэфныя вайсковыя часьці.

2-га мая адбыўся парад фізкультурнікаў і т-ва Асоавіяхіму. ФІЗКУЛЬТУРНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ БЫЎ УРАЧЫСТА ПЕРАДАНЫ ПЕРАХОДНЫ СЬЦЯГ ЦВК БССР. На пляцы адбыліся фізкультурныя спаборніцтвы.

Да першамайскіх сьвят на прадпрыемствах было арганізавана шмат новых ударных брыгад. На фабрыцы «ЧЫРВОНЫ ХАРЧАВІК» арганізаваны 5 ударных брыгад імя «518» і «1040». У такарным цэху МЭХАНІЧНАГА ЗАВОДУ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА створана ўдарная брыгада рабочай моладзі і фізкультурнікаў. У друкарні ва ўдарныя брыгады ўліпося яшчэ 40 лепшых рабочых.

Рабочыя высоўваюць сустрэчныя расцэнкі і нормы выпрацоўкі, зьніжаючы сабекошт прадукцыі на 15 проц.

Чырвонаармейскія часьці адзначылі першамайскія сьвяты разгортваньнем калектывізацыі. У дывізіі імя Дзяржынскага ў калгасы ўступіла 200 чырвонаармейцаў. Культэстафэта скончана выпускам 250 байцоў са школ лікбезу і 1100 чал. са школ малапісьменных. У ЧАСЬЦЯХ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАМІ-ЎДАРНІКАМІ БАЯВОЙ ПАДРЫХТОЎКІ ПАДАНА ШМАТ ЗАЯЎ АБ УСТУПЛЕНЬНІ Ў ПАРТЫЮ.

У дні 1 і 2 мая ў горадзе пасьпяхова праведзены збор сродкаў на карысьць МОПР'у.

А. М.

Генэральная праверка падрыхтоўкі да сплаву

Леспрамгасы і сплаўканторы БССР ЯШЧЭ НЕ ГАТОВЫ

РАБОЧАЯ СІЛА СПЛАВУ НЕ ЗАБЯСЬПЕЧАНА

Магілеўскі і Вульскі леспрамгасы ганебна плятуцца ў хвосьце

Прывесьці ў баявую гатоўнасьць увесь сплаўны апарат. Неадкладна пераключыцца на баявыя тэмпы падрыхтоўкі

МНОГА МІТУСЬНІ І... МАЛА СПРАВЫ

(Ад нашага карэспандэнта)

Вада ў Заходняй Дзьвіне спадае. Галоўны рум па Вульскім раёне—**Астралянскі**—застаўся зусім непашкоджаным, дзякуючы своечасова прынятым мерам да яго ўмацаваньня.

У **Рыпінічыне** палова руму зьнесена. Мясцовыя арганізацыі не пакланяцца, каб умацаваць яго. Страты складаюць прыблізна 2.600-3.000 руб.

Падрыхтоўка да лесасплаву па Вульскім раёне праходзіць зусім нездавальняюча. Вось некалькі фактаў, якія характарызуюць бюракратычныя адносіны да падрыхтоўкі з боку раённых арганізацый.

Вульскі леспрамгас заключыў дагавор з сялянамі в. в. **Чэрчыцы і Рыпіншчына** на загатоўку 80 лодак. Да гэтага часу зроблена толькі каля 10 лодак. Прычына—адсутнасьць смалы. Між тым, за 2 кілёмэтры ад Чэрчыцы ёсьць смалярня, дзе смалы, колькі хочаш. Галаванцяны з леспрамгасу выпісваюць смалу... з Віцебску, а з Вулы смалу пакіроўваюць... у Віцебск. Колькі не клапаціліся сяляне-лодачнікі, з смалы на месцы атрымаць не змаглі.

Загадчык **Вобальскага леспрамгасу** катэгарычна забараніў сячы карчы на какоры для лодак.

Дзесятнік **Пэйсаховіч** заявіў лодачнікам: «Спачатку выканайце парад па вывазцы лесу, а потым рабеце лодкі».

Зараз аб падрыхтоўцы да сплаву амаль ніхто ня думае. Мітусьні многа, а толку мала. Харчаваньне не арганізавана. Парад абслугоўваюцца зусім дрэнна. Прадстаўнік сплаўканторы **Лейсгольд** распарадзіўся: «Прадукты выдаваць толькі па запісках дзесятніка Хацянава». Між тым, Хацянаў ніколі на руме ня бывае.

Прадстаўнікі Экспартлесу **Шуб, Палей і Каменеў** злачынна нядбайна адносяцца да сваіх абавязкаў. Замежны бракёр **Камянковіч** бракуе экспартны лес, як яму захочацца, бяз усякіх падстаў, а гэтыя спэцыялісты нават і не паказваюцца на руме. Ніякіх канфліктаў яны амаль ніколі ня ўзьнімаюць, бо ня ведаюць наогул, што робіцца з экспартным матар'ялам. У выніку, акрамя вялікага процанту браку (да рэчы, які процант—ніхто ня ведае) засталося зусім непрынятых каля 700 бэлек, а за кожную бэльку краіна пясе матар'яльную страту.

Дзесятнікі па сплаве зусім дрэнна забясьпечаны абуткам. Так, дзесятнік **Аксельрод**, пры стараньнях якога ў значнай меры захаваны адзін з вялікіх румаў, увесь час працаваў у дзіравых ботах, пакуль не захварэў.

Бюракрат з віцебскай сплаўканторы **Рапакорт** на просьбу адпусьціць 2 тросты для румаў, адказаў: «шт ў мяне фабрыка? адкуль я іх буду браць».

Такіх фактаў вельмі шмат, але і гэтага досыць, каб паказаць ніто на Вульшчыне з падрыхтоўкай да сплаву зусім дрэнна. Троба прыняцца да адказнасьці вінаватых у гэтых агідпасьцях і па-баявому прыступіць да сплаву.

А. Мікуцкі.



Дом для рабочых у Гомелі

Чаго чакае Магілеўскі леспрамгас?

МАГІЛЕЎ, 4. (Наш кар.). Гэтымі днямі павінен распачацца сплаў. Адпнак, кіраўнікі Магілеўскага леспрамгасу не адчуваюць гэтага важнейшага моманту. Падрыхтоўка да сплаву ідзе недапушчальна марудна. Леташнія памылкі ня ўлічаны і не выпраўляюцца.

Асабліва дрэнна стаіць справа з забесьпячэньнем сплаву рабочай сілай. Паводле пляну, патрабуецца 340 чал. для возкі і 350 для сплаву. Колькі рабочых ёсьць на сёньняшні дзень, дзе і як ідзе вярбоўка—кіраўніцтва леспрамгасу ня ведае.

У гэтым годзе, паводле пляну райлеспрамгас павінен сплавіць 77 тыс. кубамэтраў будаўнічага матар'ялу. 43 тыс. кубамэтраў павінны быць сплаўлены пры першай вадзе, а да 15 ліпеня 80 проц. усяго заданьня. Здавалася-б, што кіраўнікі леспрамгасу павінны былі-б па-бальшавіцку ўзяцца за працу, мабілізаваць усе сілы на выкананьне пляну сплаву. Але леспрамгасаўцы мала клапоцяцца аб падыходзячым сплаве. Апарат леспрамгасу не пераключыўся на ўдарныя тэмпы работы.

Трэба рашуча ўдарыць па апартуністычнай бязьдзейнасьці леспрамгасу, прыняць зараз-жа меры да ліквідацыі прарыву ў падрыхтоўцы да сплаву.

Кулацка-заможныя элементы вядуць шалёную агітацыю супроць сплаву, а мясцовыя арганізацыі не даюць ім належнага адпору. Трэба нанесьці руйнуючы ўдар па кулаках, якія імкнуцца сарваць кампанію.

П.

УДАРНІКІ ПОЛАЦКАГА ЛЕСПРАМГАСУ МАБІЛІЗАВАЛІ СЯБЕ НА ПАСЬПЯХОВАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ СПЛАВУ

ПОЛАЦАК (Наш кар.).

У адказ на заклік тульскіх рабочых ЗЛЁТ УДАРНІКАЎ ПОЛАЦКАГА ЛЕСПРАМГАСУ мабілізаваў сябе на ліквідацыю прарыву першага кварталу і поўнае выкананьне і перавыкананьне пляну другога кварталу. Ударнікі абавязаліся:

уцягнуць у сацспаборніцтва і ўдарніцтва ўсіх рабочых і служачых леспрамгасу, пераключыцца на бальшавіцкія тэмпы работы;

арганізаваць новыя ўдарныя брыгады ў лесе;

весьці сыстэматычную растлумачальную работу аб перавазе брыгаднага мэтаду працы перад аднасобным;

у кожным вучлесгасе арганізаваць і замацаваць НЯ МЕНШ 30 СТАЛЫХ РАБОЧЫХ з батрацка-бядняцкай часткі вёскі, з тым, каб гэтыя рабочыя сталі асноўным пралетарскім касьцёкам на лесазагатоўках і на іншых галінах працы;

давесьці плян лесазагатовак, лесакультуры, падсочкі і інш. да кожнай брыгады і рабочага, арганізаваць сустрэчныя прамфінпляны;

забясьпечыць поўнае і своечасовае выкананьне праграмы сплаву:

арганізаваць у кожным вучлесгасе НЯ МЕНШ АДНАГО КАЛГАСУ і забясьпечыць актыўны ўдзел усіх рабочых і спэцыялістаў у правядзеньні другой бальшавіцкай вясны;

арганізаваць вытворчыя гурткі пры кожным цэхрабачкоме, з тым, каб укараніць у гушчы рабочых лёзунг т. Сталіна аб аўпаданьні тэхнікай.

Ударнікі зьвярнуліся да Полацкага Вульскага, Вушацкага і Ветрынскага РВК, а таксама да ўсіх сельсаветаў гэтых раёнаў з просьбай дапамагчы практычна ў правядзеньні лесасплаву і летніх лесазагатовак. ЗЬЛЁТ ВЫКЛІКАЎ РАБОТНІКАЎ БОРКАВІЦКАГА ЛЕСПРАМГАСУ НА СПАБОРНІЦТВА на ліквідацыю прарываў першага кварталу і выкананьне пляну другога.

Тэлеграма тав. Галадзеда

Усім райвыканкомам

У мэтах магчымасьці сплаву драўніны прымеце хуткія меры для аднаўленьня разбураных заставак. Для кіраўніцтва работамі мабілізуйце ўсіх гідратэхнікаў і дзесятнікаў раёну. Арганізуйце трохзьменную рабочую і гужавую сілу для выкананьня работ. Лесаматар'ялы адпускаюцца Лесбелам. Аплата рабочым вытвараецца ўласьнікам заставак.

Паведамленьні

— 8-га мая, у 6 гадз. вечара, у Культпроце ЦК КП(б)Б склікаецца нарада па ўвязцы партасьветы з вывучэньнем тэхнікі. На нараду павінны зьявіцца наступныя т. т.: Кулінёнка, Любін, Улазаў, Саевіч Сімёнаў, Янкевіч, Перліна, Альпінская, Гурэвіч—зав. «Камунар», Ханіна—друкарня—Слонім, Валасевіч, Немец, Макоўскі, Садоўскі, Шукевіч, Гольштэйн, Гурвіч, Ц., Голанд, Апольскі, Рудой, Серафімаў, Зарамбоўскі. Яўка абавязкова.

— 7-га мая, у 7 гадз. веч., у памяшканьні б. аб'яд. МК саюзу хэмікаў (рог пл. Волі і Козьма-Дзям'ян., уваход з пл. Волі) адбудзецца пасяджэньне аб'яднанага бюро скаргаў з разглядам наступных спраў: 1) Аб недахопах у рабоце люстэрнай ф-кі таркамітэту ўзаемаданамогі. 2) Аб недахопах у рабоце пральні Абкамтрэсту. 3) Справа гр. Тоўсьцік. Усе т. т., якіх гэтыя справы датычаць, павінны зьявіцца. Выклікаюцца рабочыя засядацелі т. т. Непраш, Паўловіч, Гутман—пчотачная ф-ка, Сьлесар, Бацьвінік, Кузьмінаў, Раецкі—абутковая ф-ка, Навіцкі, Залескі, Розэнгаўз—бойня, Кавалеўскі, Ігнатовіч, Грынчук—Эльвод. Запрашаюцца члены саюзу.

— Менгарком КП(б)Б паведамляе, што ў Жакце № 11, 5 мая г. г., у 7 гадз. веч., у памяшк. сталоўкі ЖАКТу (Камсамольская, 40) адбудзецца пазачарговы сход камуністаў і камсамольцаў, якія пражываюць у дамах ЖАКТу № 11. Яўка абавязкова.

— Менскі гарадзкі камітэт ЛКСМБ, рэдакцыя газэты «Чырвоная Зьмена» і аддзел Энэргецікі НДІ прамысловасьці склікаюць на 6-V-31 г., у 7 гадз. веч., у памяшканьні Менгаркому КП(б)Б (заля пасяджэньняў) нараду спэцыялістаў энэргетыкаў, ударнікаў, рацыяналізатараў і плянавікоў Эльводу, ЦЭО, і ўсіх мэханізаваных фабрык і заводаў на пытаньні становішча шэфства КСМ над электрафікацыяй. На нараду запрашаюцца ўсе інжынэры і тэхнікі на электра і цеплатэхніцы. Сакратарам калектываў КСМ, старшыням рацыяналізатарскіх і плянава-аперацыйных груп, экспамірацаўнікам мэханізаваных фабрык і заводаў яўка абавязкова. З даклядамі выступаюць: па электратэхніцы—інжынэр Калмыкаў, па цеплатэхніцы—інжынэр Лабуцін.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Правілы прыёму ва ўсебеларускую саўпартшколу 2-й ступені імя Дзяржынскага ў г. Гомелі ў 1931 годзе

(Асеньні набор)

Усебеларуская саўпартшкола складаецца з 3-х адзяленьняў, з якіх адно для працаўнікоў калгасаў (партработнікаў, партасьветработнікаў, арганізатараў), другое—прапагандыстаў для гарадоў і трэцяе—тэхнічнае адзяленьне, рыхтуе газэтных кадры для раённых і калгасных газэт.

На калгаснае адзяленьне прымаюцца рабочыя і батракі, члены партыі з стажам ня менш двух год і члены КСМ з вытворчым рабочым, або батрацкім стажам ня менш чатырох год. Для батракоў і батрачак (ідэйна і занятрабаванымі ў адносінах да гаспадаркі могуць быць выключаны.

Увага: Камсамольцы ня члены партыі) павінны складаць не больш 10 проц. агульнага ліку прынятых.

На прапагандысцкае і газэтнае адзяленьні прымаюцца рабочыя і калгасьнікі, выключна члены партыі з трохгадовым партыйным стажам і члены ЛКСМ з гадовым партстажам, якія маюць камсамольскай работы ня менш года.

Увага: Тыя, што паступаюць на Усебеларускую саўпартшколу, павінны мець вопыт практычнай грамадзкай работы, прычым на прапагандысцкае адзяленьне ў першую чаргу прымаюцца т. т., якія маюць вопыт прапагандысцкай работы.

Тыя, што паступаюць у саўпартшколу, павінны умець добра чытаць і пісаць на бацьмоце, знаходзіць галоўную думку і выкладаць не пісьмовым шляхам, добра ведаць чатыры дзесяцігодкі, мець цэлымі лічбамі і ўлазаць агульнапалітычнай падрыхтоўкай у разьмеры двухгадовай вячэрняй саўпартшколы.

Увага: Курсанты завочнай саўпартшколы, што скончылі першы курс гэтай школы, прымаюцца на асноўны курс саўпартшколы бяз іспытаў, а тыя, што скончылі другі курс ЗСССПШ, прымаюцца на 2-ці курс дзеннай саўпартшколы.

5. Набор курсантаў у саўпартшколу праводзіцца камісіямі, створанымі пры гаркомах і райкомах КП(б)Б. Сваю работу камісіі пачнуць закончыць да 30-га мая 1931 году. Усе матар'ялы па камплектаваньні павінны загадзя быць дасланы ў саўпартшколу.

6. Т. т., вылучаныя гаркомамі і райкомамі КП(б)Б для паступленьня ў саўпартшколу і якія прайшлі кваліфікацыйную камісію пры Усебеларускай саўпартшколе, прымаюцьбуюцца да школы, для праходжаньня дасаўпартшкольскай падрыхтоўкі, шляхам завочнага навучаньня, якое пачынаецца з 1-га чэрвеня па 15-та зьніўня 1931 году.

7. Т. т., што прайшлі завочную падрыхтоўку, выклікаюцца на канферэнцыю з 15 па 20 жніўня 1931 году, дзе кантрольна-ліквідацыйная выпытаньне аб іх заліку ў школу.

8. Для слабо падрыхтаваных батракоў арганізуюцца пры школе месячныя падрыхтоўчыя курсы, аб тэрміне работы якіх паведамляецца асобна.

9. Пры саўпартшколе стварэецца мандатная камісія ў складзе загадчыка школы, загадчыка навучальнай часткі, сакратара партбалектыву школы і прадстаўніка гаркому КП(б)Б, ЛКСМ і гарпалітасьветы.

Прыймовыя іспыты для тых, што не прайшлі завочную падрыхтоўку, адбываюцца з 20 па 25 жніўня 1931 году. Заняткі пачынаюцца 1-га верасьня.

10. У саўпартшколу не дапускаюцца хворыя заразьлівымі хваробамі, у тым ліку венэрычнымі, туберкулёзам, нэўрастэніяй у цяжкай форме і непаздараўвёўныя пасьля цяжкіх хвароб. Інвалідзнасьць ня можа служыць перашкодай для паступленьня ў школу, калі яна не перашкаджае разумовай працы.

11. Тыя, што камандыруюцца ў саўпартшколу, забясьпечваюцца мясцовымі арганізацыямі сродкамі на праезд у абодвы канцы: аправа таго, ім павінна быць выдана пэнсія за адзін месяц наперад на падставе пастановы Наркампраны за № 29 ад 1930 г.

12. Камандыроўка не гарантуе прыёму ў школу. Імянрынятыя ў школу тарочаюцца назад, за імі захоўваюцца займаныя імі раней пасады.

13. Школа прадастаўляе курсантам кватэру ў агульным памяшканьні, пасьцелькамі прылады, харчаваньне, патрэбныя падручнікі і, аправа таго, стыпендыю. Сямейныя курсанты атрымліваюць дадатковую стыпендыю ў залежнасьці ад віку ўтрымліваў і іх матар'яльнай забясьпечанасьці.

14. Школа не бярэ на сябе абавязкаў па забясьпячэньні кватэрамі сем'яў курсантаў.

15. Т. т., што камандыруюцца ў школу, павінны мець наступныя дакументы: 1) камандыроўку ад гаркому, або райкому КП(б)Б; 2) характарыстыку аб работе, плянуе адпаведным гаркомам, або райкомам; 3) дакумант аб узросьце; 4) дакумант аб адносінах да вайсковай службы; 5) завераную анкету; 6) падпіску таварыша, які камандыруецца, аб тым, што правілы паступленьня ў школу яму вядомы.

16. Агульны кантынгент асеньняга набору устанавіць у колькасьці 200 асоб.

Размеркаваньне месц ва Усебеларускую саўпартшколу па гаркомах і райкомах устанавіць паступнае:

Гаркомы і райкомы	Лік камандыраваных
1. Менскі гарком	20
2. Гомельскі гарком	30
3. Віцебскі гарком	20
4. Бабруйскі райком	15
5. Магілеўскі райком	10
6. Полацкі райком	20
7. Аршанскі райком	10
8. Мазырскі райком	5
9. Барысаўскі райком	15
10. Гомельскі райком	15
11. Лубноўскі райком	5
12. Астатнія райкомы павінны камандыраваць па	3

За загадчыка адд. культуры і прапаганды ЦК КП(б)Б РЫЧКОЎ.

Загадчык усебеларускай саўпартшколы
ВАЛЮКЕВІЧ.

Беларускі Дзяржаўны Тэатр
5 мая закрыты спектакль для с-зу нарсуды. Пач. у 8 г.
Дзяржаўны Тэатр І. Гурскі
КАЧАГАРЫ п'еса ў 4 дзеях.

Гукавы фільм ЭНТУЗІЯЗМ (Сымфонія Данбасу) Хроніка Белдзяржкіно № 17
Кіно-тэатр „Чырвоная Зорка" 7, 8-45 і 10-30
Гукавы фільм СУСЬВЕТНАЕ ІМЯ
Кіно-тэатр „Культура"
З 2 па 5 мая фільм ШЛЮБ аб ЗАКАХАЦЬ
Кіно-тэатр „Пралетарыят"
Пач. 1 с. у 6 г. Каса—з 4 г. д. в.
Масквін Зьмяны
СЯСТРА № 6 ЖАНЧАСЬЦІ
Кіно-тэатр „Гарадзкі"
Дзіцячы фільм ГОСЬ ЕШЧАМІ
Кіно-тэатр „Пушкін"
Звыш праграмы кіно-часопіс.
З 2 па 10 мая выдатны фільм АДЗІН З ДВАНЦАЦІ
Драма ў 7 частках.
Кіно-тэатр „Спартак" 7, 8-45 і 10-30
Дзяцям 5 гадз.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
СЁНЬНЯ, 5 МАЯ
— ПРЭМ'ЕРА! —
Новы гукамаляваны гукавы фільм выдатнага рэжысёра Дзіги Вертаў „СЛУХАЙЦЕ"
ЭНТУЗІЯЗМ
(СЫМФОНІЯ ДАНБАСУ)
Аўтар-рэжысёр Д. Вертаў.
Аператар Б. Цэйтлін.
Гука-аператар Н. Цімарцоў.
I. ЦЕНЬ МИНУЛАГА.
II. АПОШНЯЯ НЯДЗЕЛЯ.
III. ТРЫВОГА.
IV. НАСТУП.
V. СА СЬПЕВАМІ І ПЛЯСКАМІ.
VI. ПОЎНЫ ХОД.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
Кіно-хроніка Белдзяржкіно № 17
Папярэдні продаж білетаў у тэатр. раб. касе.
Пачатак сэансу у 7. 8—45 і 10—30.
Каса—з 5 гадз.
Асобы, якія спазьніліся, не дапускаюцца

Сэктар кадраў Белкаапсаюзу абвяшчае НАБОР СЛУХАЧОЎ
на 3-месячныя курсы старшых скотнікаў,
3-месячныя курсы старшых сьвінароў і паўтора месячныя курсы масларобаў.
На курсы прымаюцца ў першую чаргу рабочыя прыгарадных гаспадарак, калгасьнікі, батракі і бедняцкія камандыроўкі прыгарадных гаспадарак ЦРК, райсаюзаў, сьвінаадкормачных пунктаў і праўленьняў райсаюзаў і ЦРК.
За задмоцнымі на курсы захоўваецца іх зар. пэнсія па месцы працы за кошт камандыруючай арганізацыі.
Курсанты забясьпечваюцца харчаваньнем і інтэрнатам за кошт БКС.
Жадаючыя паступіць на вышэйпазначаныя курсы павінны сумесна з камандыруючай арганізацыяй, або расцэньвацца ў куды, каб выдаць ім пасьведчаньне аб прадпісаньнях, паступіць на курсы, і аб сацыяльным становішчы, аб асьвеце і дамаху ва ўзросце.
Усе дакументы накіроўваць у сэктар кадраў Белкаапсаюзу да 12-га мая г. г. на адрасе Менск, Белкаапсаюз, сэктар кадраў.
469

МЦРК даводзіць да ведама ўсіх пайшчыкаў, што перамена наборных картак БУДЗЕ ПРАВОДЗІЦЦА.
ТОЛЬКІ ДА 9-га МАЯ г. г.
З 10-Y продукты на старых картках ня будуць адпускацца.
Парадак выдачы гляді „Зьвязду" № 119 ад 27-IV—31 г.
Пункты працуюць з 9 гадз. раніцы да 10 гадз. вечара.
475 Праўленьне.

1-шы Ўсебеларускі зьезд працаўнікоў інжынэрна-тэхнічных сэкцый саюзу машынабудаўніцтва
адкрываецца сёньня ў 6 гадз. веч., у клюбе мэталістаў (Універсытэцкая, 12).
Фракцыя зьезду ў 5 гадз. веч. у тым-жа клюбе.
Рэгістрацыя делегатаў будзе праводзіцца сёньня мая з 10 гадз. раніцы да 3 гадз. дня ў Доме Працы (3-ці паверх. пакой 16).

ПРАЎЛЕНЬНЕ МЦРК даводзіць да ведама ўсіх мясцовых паштаўчыкоў, што з 1-га мая г. г. Хлебазаводу, аддзелу грамадзкага харчаваньня (усім сталовым), сельска-гаспадарчаму аддзелу (усім саўгасам), транспартнаму і будаўнічаму аддзелам
адкрыты асобныя кантакарэнтныя рахункі у Дзяржбанку
Усе такія, якія датычаць гэтых прадпрыемстваў, трэба пісаць ім у адрыва на іх кантакарэнты.

БЕЛАРУСКАЕ КІРАЎНІЦТВА СУВЯЗІ
даводзіць да ведама ўсіх партыйных, прафэсыянальных, сэкцыяльных, аператыўных і гаспадарчых арганізацый і установаў і наогул усёй грамадзкасьці,
што з 1 мая пачынаюць функцыянаваць
ПАВЕТРАНЫЯ ЛІНІІ
для перасылкі паштовай карэспандэнцыі ня унутры СССР таксама і за мяжу.
Перасылка карэспандэнцыі на аэраплянах на далёкую адлегласьць пасьпараецца ў 3 і больш раз у параўнаньні са звычайнай, таму карысьтаньне ёю вельмі матэзгодна.
Падрабязныя даведкі аб таксах, відах карэспандэнцыі, авіа-лініях і часе адыходу самалётаў можна атрымаць у кожным прадпрыемстве сувязі.
БЕЛКІРСУВЯЗІ.

СЛУХАЙЦЕ!
Радыёстанцыя імя Камінтэрну штодзённа з 23 г. 30 м. перадае зьмест „ПРАВДЫ" на наступны дзень.
Перадаюцца: перадавая, агляд друку, асноўныя артыкулы і падборкі.
Апрача эфіру, перадача ідзе ў гэты час па правадох на рупары ў кватэры рабочых МАСКВЫ і інш. гарадоў.
У дні, калі матар'ял „ПРАВДЫ" будзе гаварыць аб рабоце іншых партарганізацый гэта перадача будзе ісьці праз адпаведныя мясцовыя радыёстанцыі.
Мясцовыя радыёстанцыі ў дзень перадач будуць загадзя папярэджваць.
Слухайце штодзённа з 23 гадзін 30 мінут асноўны зьмест „ПРАВДЫ" на сяўтрашні дзень.
Станцыя імя Камінтэрну—РВ 1, частота 202,5 кілёцыклю, хваля 1.481 мэтр.
Штодзённа патрабуйце „ПРАВДУ" ва ўсіх кіёсках і ў газэтчыкаў.
Падпісвайцеся на „ПРАВДУ"! За новыя мільёны чытачоў „ПРАВДЫ"!
Выд-ва ЦК УсеКП(б) „ПРАВДА" Радыёкіраўніцтва НКПТ.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА СЭКТАР КНІГАРАСПАЎСЮДЖАНЬНЯ
Да ведама падпісчыкаў на творы ЛЕНІНА.
У зьвязку з тым, што раз падпісчыкоў ня выкупілі творы ЛЕНІНА, з прычыны зьмены адрасоў, і не паведамілі аб гэтым БДВ, паведамляем,
што падпіска ўсіх тых падпісчыкаў, што ня выкупілі том трэці, АНУЛЮЕЦЦА.
У выпадку напрысылкі вестак аб зьмене адрасоў да 15-га мая, творы дасылацца ня будуць і задатак не вяртаецца.
Адначасова з гэтым адкрываецца новая падпіска на творы ЛЕНІНА па цане 12 руб. за збор твораў. Задатак 2 рублі, а астатнія па атрыманьні кніг у растэрміновае.
Падпіска прымецца поштай і філіялмі Белдзяржвыдавецтва.

Менскі друкарня «Зьвязды»
Галоўлітбел № 337